КУЛЬТУРА

штотыднёвая грамадска-палітычная газета | выдаецца з кастрычніка 1991 года | № 15 (1662) | 12 красавіка 2024 г.

Сёння ў Палацы Рэспублікі ў рамках фестывалю "Беларусь — мая песня" адбудзецца гала-канцэрт Гродзенскай вобласці "Прынёманне: зямля і людзі". Сярод выканаўцаў — артыстка беларускай эстрады Аліна Чыжык (на фота).

Працяг тэмы — на стар. 2, 6

9 771994 478007 24015

З нагоды Дня касманаўтыкі

У Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна плануецца сумеснае мерапрыемства: 12 красавіка кіраўнікі краін мусяць падвесці вынікі місіі на МКС, дзе ўпершыню працаваў экіпаж Саюзнай дзяржавы.

Першая ў гісторыі незалежнай Беларусі жанчына-касманаўт Марына Васілеўская і расійскі касманаўт Алег Навіцкі, наш зямляк, 6 красавіка вярнуліся з МКС на борце карабля “Саюз МС-24”. Навіцкі пабываў на арбіце ўжо ў чацвёрты раз, а Васілеўская дэбютавала. Палёт Марыны доўжыўся 14 сутак, 12 з якіх яна прабавіла на Міжнароднай касмічнай станцыі. Там Васілеўская выконвала навуковую праграму, распрацаваную Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі сумесна з “Раскосмасам” і Расійскай акадэміяй навук.

— Беларусь, дзякуй за падтрымку, — такімі былі першыя словы Васілеўскай пасля вяртання на Зямлю. — Перадаю прывітанне ўсім беларусам, усім, хто мяне падтрымліваў, хто за мяне хварэў і перажываў...

А хвалявалася за яе і за Алега Навіцкага ўся краіна. І, пэўна, больш за іншых — Прэзідэнт Беларусі. Выпраўляючы “сваіх дзяцей” у далёкую вандроўку, Аляксандр Лукашэнка 19 сакавіка па відэа-канферэнц-сувязі правёў сустрэчу, падчас якой сказаў: “Мы будзем вельмі перажываць за вас”. Кіраўнік дзяржавы трымаў руку на пульсе цягам усёй місіі ўдзельнікаў экіпажа 21-й экспедыцыі, сачыў у прамым эфіры за іх вяртаннем з Міжнароднай касмічнай станцыі. Свае эмоцыі лідар патлумачыў так: “Калі тваё дзеці будуць у космасе, зразумееш, што такое грамадзянка Беларусі, грамадзянін Беларусі ў космасе... Я вельмі задаволены, што ўсё скончылася”.

Задаволена вынікамі місіі і Марына Васілеўская. “Гэты палёт у космас я прысвячаю нашаму народу, нашай Беларусі!” — сказала яна пасля прызямлення ў Нацыянальным аэрапорце Мінск: 11 красавіка Марына вярнулася на радзіму, дзе адважную дзяўчыну чакаў медаль Героя Беларусі.

На ўрачыстай цырымоніі ўшаноўвання беларускіх касманаўтаў Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што апошнія два тыдні краіна жыла пад адным лозунгам — “Космас наш!”.

Прэзідэнт адзначыў: “Палёт касманаўта Марыны Васілеўскай на МКС вывеў суверэнную Беларусь на новы ўзровень удзелу ў касмічных праграмах і новы ўзровень саюзных адносін з Расіяй”. А сімвалам братэрскіх сувязей двух народаў сталі дзяржаўныя сцягі, разгорнутыя на вышыні больш як 400 кіламетраў ад Зямлі.

На шляху да сусветнага аркестра

Дасье нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці “Культура беларускай дуды” 29 сакавіка накіравана Міністэрствам культуры ў сакратарыят Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны UNESCO.

Падрыхтоўцы намінацыі папярэднічала істотная работа па вывучэнні традыцый дударства ў Беларусі. У 2023 годзе культуры беларускай дуды быў нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Гэтая з’ява распаўсюджана на тэрыторыі Віцебскай, Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай абласцей і горада Мінска. Сёння налічваецца больш за 32 носьбіты і 100 пераемнікаў гэтага элемента. Дасье было падрыхтавана ў 2024 годзе Мінскім аблвыканкамам пры каардынацыі Міністэрства культуры ў адпаведнасці з патрабаваннямі UNESCO.

Беларусь — мая песня

Больш за 50 найлепшых калектываў і каля тысячы артыстаў Гродзеншчыны выйдуць сёння на сцэну Палаца Рэспублікі. Гала-канцэрт “Прынёманне: зямля і людзі” мусіць стаць чарговым яскравым акордам у творчай справаздачы рэгіёнаў. Фінальны этап фестывалю “Беларусь — мая песня” ладзіцца ў сталіцы з 2 лютага па 19 чэрвеня.

Падчас маштабнага культурнага марафону на галоўнай святочнай пляцоўцы краіны свае таленты дэманструюць усе вобласці і горад Мінск. Найлепшыя прафесійныя і аматарскія калектывы, салісты прадстаўляюць вакальнае, харэаграфічнае, цырковае мастацтва.

Сёння ў Палацы Рэспублікі выступяць артысты Гродзеншчыны. У праграме “Прынёманне: зямля і людзі” задзейнічаны заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь ансамбль танца, музыкі і песні “Белыя росы”, музычны тэатр “Рада”, папулярная эстрадная спявачка Аліна Чыжык, хары ўстаноў адукацыі сферы культуры, а таксама вядучыя калектывы мастацкай творчасці. У фае разгорнецца выстава дасягненняў культурнай галіны з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, вырабаў народных майстроў.

У аснове канцэпцыі гала-канцэрта — таленавітыя, працавітыя і адданыя сваёй зямлі людзі, якія годна прайшлі ўсе выпрабаванні і сёння ўпэўнена рухаюцца па шляху стварэння і развіцця. Эпізод “Беларусы падзеленай зямлі: за намі праўда!” адлюстроўвае 1921—1939 гады, “І ўсё ж такі мы перамаглі!” — раскрывае гераізм падчас ліхалецця ў 1941—1945-м. Сімвалічна: у гэтым годзе край адзначае двайны юбілей — 80-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ўтварэння Гродзенскай вобласці, што будзе паказана ў частцы “Нараджэнне Гродзенскай вобласці”. А эпізод “Прынёманне патрыятычнае і духоўнае — трэба трымацца разам!” стане кульмінацыяй, якая падкрэсліць лейтматыў канцэртнай праграмы: Прынёманне выстаяла перад усімі бедамі і сёння будзе моцную, незалежную і квітнеючую Беларусь.

Падчас мерапрыемства

Баявая агітбрыгада

Шэфская творчая акцыя “Баявая агітбрыгада”, прысвечаная 80-годдзю вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, стартавала 10 красавіка ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

На адкрыцці выступілі намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Іна Адамовіч, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Варапаеў, старшыня Беларускага грамадскага аб’яднання вэтэранаў генерал-маёр Іван Гардзейчык ды іншыя.

Лейтматывам прамоў стала думка, наколькі важна захаваць памяць аб вайне, перадаць будучым пакаленням пачуццё пашаны да подзвігу продкаў, разуменне значнасці Вялікай Перамогі для нашай краіны і ўсяго свету. Выступоўцы падкрэслівалі, што трэба ганарыцца Перамогай і не забываць аб уроках вайны, ахвярамі якой сталі дзясяткі мільёнаў чалавек.

Згодна з канцэпцыяй акцыі, творчыя калектывы і выканаўцы наведаюць вайсковыя часці і прадпрыемствы, дзе дадуць канцэрты, правядуць сустрэчы з ваеннаслужачымі і работнікамі. Акрамя традыцыйных нумароў, запланаваны тэматычныя лекторыі і кінапаказы.

На адкрыццё акцыі былі запрошаны ветэраны, курсанты Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, навучэнцы адукацыйных устаноў краіны. Маладому пакаленню распавялі пра гісторыю агітбрыгад. Даведаліся хлопцы ды дзяўчаты і чаму менавіта “песня нам будаваць і жыць дапамагае”. У склад “Баявой агітбрыгады” ўвайшлі салісты Белдзяржфілармоніі Улада, Дзмітрый Гайдукоў і Уладзімір Данілові, мастацкі кіраўнік Беларускага дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі “Свята” Вячаслаў Статкевіч, фальклорны гурт “Купалінка”, узорны дзіцячы тэатр “Фрэскі” і заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь тэатр эстраднай песні “Сябрынка”.

Будаўніцтву — жорсткі таймінг

Чарговая апаратная нарада міністра культуры Рэспублікі Беларусь Анатолія Маркевіча з начальнікамі ўпраўленняў і аддзелаў міністэрства адбылася 9 красавіка. Дзякуючы відэасувязі, у пасяджэнні паўдзельнічалі кіраўнікі ўпраўленняў культуры абласных выканаўчых камітэтаў. Асноўным пытаннем стала рэалізацыя Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы ў сферы культуры на 2024 год.

Міністр паведаміў, што зацверджаная Прэзідэнтам Беларусі напрыканцы сакавіка дзяржпраграма прадугледжвае сур’ёзныя будаўніча-рамонтныя і рэстаўрацыйныя работы на шэрагу аб’ектаў галіны. Усяго іх 13. Агульны аб’ём фінансавання — больш за 45,5 мільёна рублёў. Анатолій Маркевіч падкрэсліў, што, напэўна, упершыню сфера культуры атрымае такія грошы на падобныя мэты за адзін год. Таму ўсе працы павінны быць выкананы ў запланаваныя тэрміны. Прытым фінансы, выдаткаваныя дзяржавай, трэба выкарыстоўваць строга па прызначэнні і не пераразмяркоўваць па іншых напрамках.

Кіраўнік галіны даручыў адказным асобам пастаянна кантраляваць работы на кожным аб’екце, асаблівую ўвагу надаць аднаўленчым працам у Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку і пабудовах Свята-Успенскага Жыровіцкага стаўрапігіяльнага мужчынскага манастыра.

Асобна Анатолій Маркевіч гаварыў пра гістарычныя будынкі, якія аднаўляюцца за дзяржаўныя грошы. Такія аб’екты павінны прыносіць карысць і дзейнічаць як цэнтры прыцягнення ў асветных, культурных і турыстычных мэтах. У прыватнасці, размова ішла пра турыстычны патэнцыял былога кляштара і калегіума езуітаў у Юровічах, а таксама пра пляцоўкі гандлю і грамадскага харчавання ў комплексе Нацыянальнага мастацкага музея.

Два буйныя аб’екты капітальнага будаўніцтва, уключаныя ў дзяржпраграму, знаходзяцца ў Мінску. Гэта будынкі Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Працы распачнуцца сёлета. Таму міністр запатрабаваў у час вырашыць арганізацыйныя пытанні размяшчэння калектываў і адпрацаваць графік выступленняў трупы горкаўцаў на сцэнах Мінска цягам рамонту.

— Важна не страціць гледача, — падкрэсліў Анатолій Маркевіч. — Людзі ведаюць і любяць Горкаўскі тэатр. Вы павінны своечасова інфармаваць, дзе іх будуць чакаць артысты ў новым сезоне.

Па старонках календара

■ **12 красавіка** нарадзілася Соф’я Дзмітрыеўна Лі (1904—1980) — беларуская мастачка. Заслужаны работнік культуры БССР. У часы Вялікай Айчыннай вайны была сувязной і разведчыцай, партыйным арганізатарам партызанскага атрада “Перамога” брыгады “Полымя” Пухавіцкага раёна, членам бюро Пухавіцкага падпольнага райкама партыі.

■ **14 красавіка** 1951 года з’явіўся на свет Віктар Дзмітрыевіч Нікіцін — заслужаны архітэктар Рэспублікі Беларусь. З’яўляецца адным з аўтараў канцэпцыі забудовы розных тэрыторый Мінска: праспекта Пераможцаў, праспекта Дзяржынскага, комплексу “Мінск-Сіці”, гандлёвага комплексу “Сталіца”, шматфункцыянальнага культурна-спартыўнага комплексу “Мінск-арэна”. Удзельнічаў у праектаванні Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Лаўрэат V Нацыянальнага фестывалю архітэктуры, XIII Рэспубліканскага конкурсу найлепшых архітэктурных твораў.

■ **16 красавіка** 1952 года нарадзіўся Уладзімір Пятровіч Савіч — беларускі мастак. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. У 2007—2013 гадах быў старшынёй Беларускага саюза мастакоў.

■ **17 красавіка** з’явілася на свет Лідзія Іванаўна Рэцкая (1899—1977) — беларуская актрыса. Народная артыстка БССР і СССР. Узнагароджана ордэнам Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, іншымі ордэнамі, медалямі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР за ролю Аўдоцці Захараўны ў спектаклі “Пяюць жаваранкі” паводле К. Крапівы. З 1921-га працавала ў Беларускім тэатры імя Янкі Купалы, выступала на радыё, здымалася ў кіно (“Хто смяецца апошнім”, “Гадзіннік спыніўся апоўначы”).

■ **17 красавіка** нарадзіўся Валерый Давідавіч Рубінчык (1940—2011) — беларускі і расійскі кінарэжысёр, сцэнарыст. Заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола БССР. З 1969-га працаваў на “Беларусьфільме”, з 1990-га — на “Масфільме”. У 1980-м атрымаў прыз журы на МКФ у Манрэалі за стужку “Дзікае паляванне караля Стаха”.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатолій Маркевіч (справа) і Міністр культуры Рэспублікі Азербайджан Адзіль Керымлі (злева)

Падчас гала-канцэрта ў Палацы імя Гейдара Аліева

Сяброўскі дыялог на мове мастацтва

Дні культуры Беларусі ў Азербайджане сталі новым этапам у двухбаковых адносінах. Візіт нашай дэлегацыі ў сяброўскую краіну дазволіў прэзентаваць замежнай публіцы скарбы айчыннай культуры і вызначыць перспектывы далейшага супрацоўніцтва. Які плён прынесла падзея, "К" даведалася ва ўдзельнікаў Дзён культуры.

Анатолій Маркевіч, міністр культуры Рэспублікі Беларусь:

— Беларуска-азербайджанскае культурнае супрацоўніцтва абапіраецца на глыбокія традыцыі і ў той жа час накіравана ў будучыню. Мы высока ацэньваем і шчыра шануем дасягнуты ўзровень супрацоўніцтва. Мы глыбока ўпэўнены, што наперадзе вельмі важную ролю ў тым, каб мы яшчэ больш даведаліся адно пра аднаго і ўмела дзяліліся досведам між краінамі. Падчас Дзён культуры намецілі для сябе шмат амбітных праектаў. І мы абавязкова іх ажыццявім, таму што творчы патэнцыял і ахвота майстроў культуры і мастацтва велізарныя.

Азербайджанскія гледачы праявілі вялікую цікавасць да беларускай культуры. Мы з нецярпеннем чакаем з адказным візітам творчую дэлегацыю братэрскай дзяржавы. Спадзяёмся, што і нашы гледачы ўбачаць самабытную азербайджанскую культуру ва ўсіх яе праявах.

Вікторыя Ратабыльская, начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння са СМІ Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь:

— Дні культуры Беларусі ў Азербайджане прадэманстравалі ўзаемную цікавасць да дасягненняў нашых народаў, засведчылі імкненне да ўмацавання сяброўства. Наша дэлегацыя паспяхова прэзентавала шматграннасць і багацце айчыннай культуры, паказала шчырасць і адкрытасць беларускай душы. Асаблівы гонар і пачуццё ўдзячнасці выклікае тое, якую вялікую павагу і цікавасць да нашых набыткаў праявіла азербайджанская публіка. У рамках візіту беларускай дэлегацыі ўдалося абмеркаваць з калегамі перспектывы развіцця культурных сувязей. Абодва бакі падкрэслілі важнасць паглыблення супольнай дзейнасці ў музейнай і бібліятэчнай справах, кінематографе і іншых нашых сферах. Неўзабаве народы Беларусі і Азербайджана ўбачаць плён дасягнутых дамоўленасцей і падпісаных пагадненняў у канкрэтных праектах. Яркім працягам дыялогу між нашымі краінамі мусяць стаць Дні культуры Азербайджана ў Беларусі: у наступным годзе чакаем партнёраў з адказным візітам.

Ірына Карповіч, начальнік упраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь:

— Візіт у Азербайджан стаўся надзвычай змястоўным і карысным для актывізацыі супрацоўніцтва, абмену досведам. Нашы краіны маюць шмат падобных рыс у функцыянаванні сферы культуры. Нас яднаюць ідэнтычныя прыярытэты і напрамкі развіцця. Таму асабліва каштоўнай лічу магчымасць пазнаёміцца з працай Цэнтра Гейдара Аліева і Азербайджанскага нацыянальнага музея дывана. Непадробную цікавасць выклікалі тэхналогіі і экспазіцыйныя рашэнні, якія выкарыстоўваюць згаданыя ўстановы для прыцягнення наведвальнікаў, якаснай прэзентацыі традыцый сучаснаму гледачу. Перспектыўным напрамкам узаемадзеяння можна назваць развіццё крэатыўных індустрый. Азербайджанскія калегі гатовы падзяліцца напрацоўкамі і ідэямі ў гэтым кірунку.

Падчас Дзён культуры падпісаны пагадненні паміж беларускімі і азербайджанскімі ўстановамі, закладзены асновы для далейшай арганізацыі сумесных выстаў, удзелу ў фестывалях і конкурсах, арганізацыі абменных гастролей і іншых супольных праектаў. Міністэрства культуры ставіць задачу не адкладваць рэалізацыю дамоўленасцей на доўгую перспектыву. І мы бачым плён паездкі ўжо зараз. Напрыклад, Азербайджан будзе шырока прадстаўлены на Міжнародным форуме "Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства", які адбудзецца 15—19 красавіка ў Магілёве. А ў пачатку мая супрацоўнікі беларускіх музеяў паўдзельнічаюць у Сусветным форуме "Дыялог дзеля міру і глабальнай бяспекі: супрацоўніцтва і ўзаемадзеянне" ў Баку. Акрамя таго, азербайджанскаму боку паступілі прапановы аб удзеле ў нашых фестывалях і конкурсах.

Падкрэслю, што падчас Дзён культуры мастацтва нашай краіны выклікала непадробнае захапленне ў жыхароў Баку — як пейзажы прафесійных мастакоў, так і вырабы народных майстроў. Мы зацікаўленыя ў тым, каб яшчэ бліжэй пазнаёміць сяброў з нашымі творчымі набыткамі. І Нацыянальны мастацкі музей ужо сёлета гатовы зладзіць першы праект у гэтым напрамку.

Ганна Конанава, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

— У Азербайджанскім нацыянальным музеі мастацтваў з поспехам адкрылася выстава беларускага жывапісу. Экспазіцыя выклікала вялікую цікавасць у бакінскай публікі. Меркавалася, што выстава будзе працаваць толькі ў рамках Дзён культуры, аднак была дасягнута дамоўленасць аб падаўжэнні тэрміну — і зараз праект даступны для прагляду ўсім ахвотным. Дэманструюцца творы пяці сучасных аўтараў, якія адлюстроўваюць непаўторнае хараство беларускай зямлі, перадаюць любоў да радзімы. У палотнах выкарыстаны матывы значных мясцін нашай краіны, такіх як Брэсцкая крэпасць, Гальшанскі замак, Полацкі Спаса-Еўфрасінневускі манастыр. Таксама важнае месца занялі творы на ваенную тэму.

Падчас візіту ў Азербайджан удалося абмеркаваць з калегамі перспектывы супрацоўніцтва. У прыватнасці, гутарка ішла аб шырокай прэзентацыі розных відаў і жанраў беларускага мастацтва на вядучых пляцоўках Азербайджана. Дасягнута папярэдняя дамоўленасць аб арганізацыі абменных выставачных праектаў, што мусяць прэзентаваць значныя калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея і нашых азербайджанскіх партнёраў. Зараз пытанне прапрацоўваецца дэталёва. У рамках Дзён культуры падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве з Азербайджанскім нацыянальным музеем мастацтваў.

Варта адзначыць, што, нягледзячы на адрозненні культур, у мастацтве Беларусі і Азербайджана ёсць і агульнае. У абедзвюх краінах даволі моцныя школы, і нават творчыя эксперыменты ладзяцца на магутным акадэмічным падмурку. Акрамя таго, у нас агульнае разуменне культуры як своеасаблівай ноты міру, якая мусіць аб'ядноўваць народы.

Юрый Аляксей, генеральны дырэктар Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм":

— Мы прэзентавалі азербайджанскім гледачам чатыры фільмы — два ігравыя і два дакументальныя. Праграму фарміравалі такім чынам, каб паказаць праз экраннае мастацтва нашы карані, традыцыі. Падчас Дзён культуры дасягнуты дамоўленасці з партнёрамі. Мы намецілі сумесныя мерапрыемствы, прапанавалі зладзіць Дні кіно Азербайджанскай Рэспублікі ў Беларусі. Таксама запрасілі калег да перамоў і пітчынгаў на нашай студыі.

Аляксандр Нікіта, генеральны дырэктар Беларускай дзяржаўнай філармоніі:

— Усе падзеі арганізаваныя на самым высокім узроўні як з нашага боку, так і з азербайджанскага. За дні візіту мы правялі вялікую колькасць сустрэч, круглы стол з удзелам творчай інтэлігенцыі. Я сустрэўся з дырэктарам Азербайджанскай дзяржаўнай філармоніі Мурадам Адыгезал-задэ. Мы прарэвізавалі мінулыя пагадненні і падпісалі мемарандум. У ходзе яго рэалізацыі ў 2024—2025 гадах на нашай пляцоўцы плануецца сольны канцэрт народнага артыста Азербайджана, піяніста Мурада Адыгезал-задэ. Таксама праведзеныя перамовы аб выступленнях Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца Беларусі і ансамбля "Песняры" на сцэнах Азербайджана, прапрацоўваецца магчымасць удзелу нашых камернага і сімфанічнага аркестраў у мерапрыемствах сяброўскай краіны.

Глеб Отчык, старшыня Беларускага саюза мастакоў:

— Колькі гадоў таму падчас працы над аздабленнем інтэр'ераў беларускага пасольства ў Азербайджане нам пашчасціла пазнаёміцца з тамтэйшымі мастакамі, усталяваць прафесійныя кантакты. У наступныя гады мы плённа супрацоўнічалі і ўмацоўвалі сувязі. Прыкладам, азербайджанскія творцы прыязджалі ў нашу краіну на пленэр. Аднак буйных супольных праектаў дагэтуль не было. І правядзенне сёлета Дзён культуры паслужыла значным штуршком да актывізацыі кантактаў. Паказаць работы сучасных беларускіх аўтараў у Азербайджанскім нацыянальным музеі мастацтваў — вялікая ўдача. Значным дасягненнем стала падпісанне пагадненняў аб супрацоўніцтве з гэтай скарбніцай, а таксама з Азербайджанскай дзяржаўнай акадэміяй мастацтваў і з Саюзам мастакоў Азербайджана. Ужо дасягнутыя дамоўленасці аб сумесных праектах. Мяркуецца правядзенне моладзевага скульптурна-жывапіснага пленэру. Неўзабаве адбудзецца выстава сучаснага мастацтва Азербайджана ў Беларусі, якая ўключыць каля паўтары сотні работ. Налета плануем адказны візіт з дэманстрацыяй айчынных твораў.

Сапраўды, нашы культуры значна адрозніваюцца, кожная мае свае адметныя рысы. Аднак ёсць і тое, што нас яднае. На развіццё мастацтва абедзвюх краін у значнай ступені паўплывалі традыцыі класічнай школы: нямала нашых вядомых мэтраў атрымалі азы ў інстытуце імя Сурыкава, акадэміі імя Рэпіна. Да таго ж светапогляд нашых лідараў і народаў даволі блізкі, і таму Азербайджан — сярод самых адданых і блізкіх сяброў нашай краіны.

Гюнэш, спявачка, уладальніца медаля Францыска Скарыны:

— Я нарадзілася ў Беларусі, аднак маю азербайджанскія карані: некалі бацькі пераехалі сюды з цудоўнага горада Губа. Я ад усяго сэрца ўдзячная беларускай зямлі за творчае прызнанне, сямейнае шчасце і сяброў. Але, вядома, душа поўніцца цёплымі пачуццямі і да этнічнай радзімы. Менавіта іх я ўкладвала ў песню "Радзіма" на азербайджанскай мове, якую выканала перад публікай у Баку. Тут быў прыняты на "ўра". Другая ж кампазіцыя — "Беларусы — людзі міру" — прагучала на беларускай мове і таксама выклікала станоўчую рэакцыю залы.

Сімвалічна, што мне давялося прычыніцца да Дзён культуры і сваім выступленнем засведчыць сяброўства між нашымі краінамі. Я ўдзячная Міністэрству культуры за такую магчымасць. Заўважу, што сустрэлі нашу дэлегацыю надзвычай гасцінна, жыхары азербайджанскай сталіцы з цеплынёй і ўвагай прынялі нашу творчасць. Хоць геаграфічна мы далёка адно ад аднаго, нельга забываць пра агульныя старонкі гісторыі. Нашы продкі плячо да пляча здабывалі мір і свабоду ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Доўгі час мы жылі ў агульнай вялікай краіне. І няхай паміж нашымі народамі заўжды будуць добрыя адносіны, няхай Беларусь і Азербайджан надалей будуць жыць у шчасці.

Самір Ёлчыеў, спявак, уладальнік першай прэміі XXXII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні "Віцебск" Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску":

— Бакінскім слухачам я прэзентаваў песню нашага мэтра Уладзіміра Мулявіна "Чырвоная ружа", якая прынесла мне поспех на "Славянскім базары". Думаю, што замежная публіка выдатна зразумела пасыл кампазіцыі, хоць яна і гучыць на беларускай мове. Рэакцыя залы была надзвычайная. Нас прынялі вельмі добра. Адчувалася моцная падтрымка азербайджанскіх сяброў. Дні культуры сталіся сапраўды грандыёзнай падзеяй, якая чарговы раз нагадала: мова творчасці, мова музыкі універсальная. Мастацтва аб'ядноўвае людзей розных нацыянальнасцей у адзіным пазітыўным парыве.

Таццяна Яфрэменка, артыстка Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца Беларусі:

— Наш калектыў прэзентаваў найлепшыя нумары са свайго залатога фонду. Мы імкнуліся паказаць замежнай публіцы ўсю шматграннасць, усё багацце беларускай культуры. Хацелася перадаць любоў да роднай зямлі, на мове танца распавесці пра самабытнасць Бацькаўшчыны. Думаю, з гэтай задачай ансамбль справіўся на выдатна. Нас прынялі з неверагоднай цеплынёй. Азербайджанская публіка праявіла шчырую цікавасць да нашай творчасці.

Стартаваў прыём заявак на XXVII Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў "Анімаёўка-2024".

Вечары Вялікага тэатра ў замку Радзівілаў у Нясвіжы пройдуць з 14 па 16 чэрвеня.

Аліна Чыжык падчас выступлення

Калі песні з сэнсам

Яе кампазіцыя "Бацькава булка" стала гімнам хлебаробаў, а трэк "Беларускі Новы год" гучаў зімой на ўсіх святочных пляцоўках. Як ураджэнка Гродзенскага раёна стала знакамітай і чым здзівіла Андрэя Малахава? Фіналістка праекта "Акадэмія талентаў" на АНТ, лаўрэат конкурсу маладых выканаўцаў у Маладзечне Аліна Чыжык дзеліцца сакрэтамі поспеху.

"САРОМЕЛАСЯ СКАЗАЦЬ, АДКУЛЬ Я"

— Мая малая радзіма — вёска Мількаўшчына. Гэта край, дзе з'явілася на свет пісьменніца Эліза Ажэшка. Там і мае карані, мая базавая школка. Памятаю, калі падлеткам паехала ў санаторый, саромелася сказаць, адкуль я. Хлусіла, што з Гродна. Цяпер ганаруся і лічу: людзі, якія нарадзіліся ў вёсцы, умеюць працаваць і дасягаць мэт. Такім асобам ніколі нічога проста не давалася. Цяжкасці на шляху робяць нас мацнейшымі. Гісторыя ведае шмат знакамітых людзей, якія прараслі з глыбінкі.

У дзяцінстве мы ўгрызаліся ў любую магчымасць, каб развівацца.

На шоу Андрэя Малахава

Кажу выхаванцам, што ў іх для гэтага ёсць усё. Музычныя школы пад бокам... Мяне бацькі вазілі ў Скідзель — а гэта за 17 кіламетраў, — чакалі чатыры гадзіны. І заўсёды падтрымлівалі.

Ганаруся, што нарадзілася менавіта на гэтай зямлі. Яна адказвае ўдзячнасцю: я артыстка года Гродзеншчыны — 2022, яшчэ мяне занеслі ў энцыклапедыю жанчын нашага раёна.

Я з музычнай сям'і. Цётка, бацькава родная сястра, — вядомы беларускі кампазітар Аліна Безенсон. Тата граў на сінтэзатары, мама ўдзельнічала ў фальклорным хоры. Былі гучныя святы, са спевамі, танцамі. Так што музыка жыве ў генах.

І вось на вяселле маёй старэйшай сястры прыехала цётка, пачула, як выконваю "За четыре моря", і сказала: "Аліну тэрмінова трэба аддаваць у музычную школу". Я была перарасткам. Аднак цётка настаяла, і дыярэктар пайшла насустрач. Давялося за год асвоіць праграмы трох класаў. Заўсёды чула пахвалы ад настаўніцы, якая хацела развіваць мяне па кірунку фартэпіяна. Але я марыла пра сцэну. Гэта мая стыхія.

Паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў на эстраднае аддзяленне. Чатыры гады вучобы падарылі мне розныя праекты, тэлевізійныя здымкі. Стала сябе актыўна праяўляць. Далей была завочная падрыхтоўка ў педагагічным універсітэце імя М. Танка. Крок за крокам пачала развівацца як артыстка.

"БАЦЬКАВА БУЛКА" ПАЙШЛА Ў НАРОД

— Каравай-фэст "Бацькава булка" з'явіўся дзякуючы нашаму Прэзідэнту два гады таму пасля яго візіту ў Свіслач. Мясцовая пякарня славіцца фірменнай "пляцёнкай". Смак вырабу, які "плятуць" уручную, знаёмы з дзяцінства. Аляксандру Рыгоравічу таксама спадабаўся гэты хлеб, які пасля пачалі называць "Бацькавай булкай". Старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр Вярсоцкі прапанаваў зрабіць яе брэндам і стварыць сацыяльна-культурны праект, падключыў рэжысёра. Вольга Багдановіч мае вялікі вопыт — праводзіць фестываль нацыянальных культур у нас у горадзе, абласныя "Дажынкі". Мы распрацавалі канцэпцыю свята. Мне, аўтару-выканаўцу, прапанавалі напісаць музыку да гімна мерапрыемства. Словы склала Вольга Томашаўна. Мелодыя нарадзілася хутка. Калі я ўбачыла верш — села за фартэпіяна і прыдумала акорды. За тры дні зрабілі аранжыроўку і запісалі песню ў студыі. Твор пайшоў у народ — цяпер мяне ўсе пазнаюць па гэтай кампазіцыі.

Ездзіла з ёй на тэлешоу да Андрэя Малахава, прадстаўляла краіну. Тэма праграмы — "Сяброўства народаў". Госці былі з розных дзяржаў, кожны з песнямі і падарункамі. Прыём — на найвышэйшым узроўні. Расіяне нас вельмі любяць. Гэта ўзаемна, мы ж братнія народы. Суседзі паважаюць нашага Прэзідэнта. Беларусь у іх асацыіруецца з зычлівымі, хлебасольнымі людзьмі. У студыі было цёпла і душэўна. Малахаў падаўся шчырым, добрым і сапраўдным. Здымкі прайшлі на адным дыханні. Рэдактары казалі: гэта была найлепшая праграма за сезон.

Вярнуўшыся дадому, адчула эйфарыю. На сабе праверыла, як гэта — прачнуцца знакамітай. Хадзіла зараджаная, і хацелася дзяліцца натхненнем з усімі. Пасля эфіру мне патэлефанавалі з Расіі і запрасілі паўдзельнічаць у канцэрце, прысвечаным Дню народнага адзінства. У TikTok убачыла пад 500 тысяч праглядаў і толькі станоўчыя водгукі. Прыхільнікі пісалі, што я годна прадставіла нашу краіну.

"МУЗЫКА ПАВІННА ВЫХОЎВАЦЬ"

— Кампазіцыі "Mi amor", "Чай земляничный", "Ловили лето", "Из-за него", "Беларускі Новы год", "Туда, где мама ждёт", "Лістапад развітальны", "Простуда" гучаць на радыё, але многія не здагадваюцца, што гэта я *(усміхаецца)*. Песні можна паслухаць на ўсіх лічбавых пляцоўках. Ёсць восем рэлізаў. На YouTube — кліпы. Актыўна раціруюся на каналах АНТ, БТ, RU.TV, Europa Plus TV Belarus, ТНТ-International (Беларусь). Днямі прадстаўлю кампазіцыю, якую прысвяціла гораду Гродна. Будзем рабіць кліп. Гэтую песню я ўжо прэзентавала на аўтарскіх канцэртах.

Мае апекаванцы ў вакальнай школе-студыі кажуць, што хочуць быць падобнымі да мяне, таму не маю права нікога падвесці. І пачуццё адказнасці навісае, як хмара. Трэба трымаць марку. Публічны чалавек не ў праве расслабляцца, так што лёс артыста нялёгкі.

Музыка — тое, што павінна выхоўваць. На музыцы людзі растуць, дзякуючы ёй напаўняюцца святлом. Таму ва ўсе песні, нават поп-кірунку, укладаю сэнс. Стараюся, каб была прыгожая мелодыя. Заставацца ў трэндзе — добра, аднак для мяне важна і каб тое, што спяваю, падабалася слухачам. Я больш канцэртны артыст, чым радыйны, бо люблю камунікаваць з гледачом.

"АДЧУВАЦЬ СЯБЕ ШЧАСЛІВАЙ"

— У мяне часта пытаюцца, як усё паспяваю. Самадысцыпліна, напэўна. А яшчэ Бог дапамагае — ва ўсім дае энергію. Як нармальны чалавек, дазваляю сабе і паленавацца. Я жанчына-генератар, аднак часам трэба зараджацца *(смяецца)*. Усё складваецца, бо сустракаюцца добрыя людзі, пераплятаюцца падзеі. Калі ты ў гармоніі з сабой, са светам, калі ты чысты знутры, то Бог вядзе і ўсё паспяваеш.

Жыву творчасцю. Я не толькі выступаю на сцэне, але і выкладаю ў школе-студыі "Логас". Ад дзяцей зараджаюся, напаўняюся іх святлом. Галоўны сакрэт — адчуваць сябе шчаслівай унутры. Калі лезуць дакучлівыя думкі — пераключаюся. Стрэс стараюся прыбіраць, бо ад яго хутка старэеш. Калі назапашваеш радасць — то застаешся маладым. Гэтага ўсім жадаю!

Надзея ЗУЕВА
Фота з архіва спявачкі

Афіша фільма, 1963

Псіхалогія "акопнай праўды"

Да дзвюх знамянальных дат — 100-годдзя беларускага кіно і 80-годдзя вызвалення нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — у студзені мы далі старт праекту "Векапомнае праз кінакадр". Ён, падрыхтаваны сумесна з Музеем гісторыі беларускага кіно і айчыннымі знаўцамі, расказвае аб знакавых ваенных стужках "Беларусьфільма".

Праз некалькі дзесяцігоддзяў пасля Вялікай Айчыннай рэжысёры пачынаюць звяртацца не толькі да подзвігу савецкага народа, але і да глыбейшай праблемы — чалавек на вайне. Нягледзячы на перавагу гераічнага вобраза, у творах экраннага мастацтва ўсё часцей з'яўляецца не асоба з плаката, а шэраговы салдат, які кожны дзень сутыкаецца са складаным выбарам. Аўтары пачынаюць раскрываць ваенную тэматыку з зусім іншага, часам нават больш жахлівага боку, бо паказваюць непрыхаваную ісціну чалавечай душы.

Сярод такіх фільмаў — "Трэцяя ракета". Кіно знята па аднайменнай аповесці Васіля Быкава рэжысёрам Рычардам Віктаравым. Карціна адрозніваецца ад звыклых ваенных стужак не толькі тым, што ў цэнтры яе — чалавек на полі бою. Сам сюжэт даволі камерны: дзеянне разгортваецца ў адной лакацыі, пра герояў мы даведваемся з іх жа вуснаў. Але рэжысёру ўдалося не звесці ўсё да тэатральнай пастаноўкі і вельмі тонка і дакладна развіць лінію кожнага персанажа.

— Галоўнае ў стужцы — аповед пра гераізм простых байцоў, пра самаадчуванне чалавека на вайне і захаванне маральных арыенціраў. У стылістыцы фільма ёсць некаторы тэатральны "прысмак", паколькі дзеянне адбываецца ў адной лакацыі, гучыць шмат дыялогаў, а таксама прадстаўлены закадравы тэкст, — дзеліцца меркаваннем **Антаніна Карпілава**, кінакрытык, кандыдат мастацтвазнаўства. — Тым не менш аператары Андрэй Кірылаў і Мікіта Хубаў змаглі раскрыць экстрэмальную атмасферу жыцця ў акопе з дапамогай буйных планаў і перадаць тонкія, часам цяжкаўлоўныя адценні ў настроі. А гукарэжысёр Мікалай Ведзянееў стварыў цэлую сімфонію вайны з адзіночных залпаў, гулу варожых самалётаў, аглушальных выбухаў і свісту авіябомбаў.

У аўтараў не ўсё атрымалася, але, напрыклад, візуальны шэраг прываблівае дакументальнай чорна-белай стылістыкай, запамінальнымі вобразамі зацягнутага парахавым дымам сонечнага дыска ці развернутай зямлі. У павільённых умовах беларускія мастакі-пастаноўшчыкі Уладзімір Дзяменцьеў і Яўген Ігнацьеў стварылі амаль матэрыялізаваную жывую прастору, напоўненую распаленай спёкай летняга дня, адчуваннем цяжкага пяску і задушлівага пылу.

Тым не менш акцэнт у фільме ўслед за літаратурнай крыніцай робіцца не на баявой атмасферы, а на ўзаемаадносінах людзей. І, здавалася б, як можна перанесці кранальную гісторыю на экран, не згубіўшы ні каштоўнасці сюжэта, ні ўвагі гледача? Аднак міжасобасныя пытанні трымаюць у напружанні да самага фіналу, які можна назваць непрадказальным для савецкай кінастужкі.

— У гэтай камернай ваеннай драме няма батальных сцэн, акцэнт робіцца на псіхалагічным дзеянні, на ўзаемаадносінах семярых байцоў маленькага гарматнага разліку, якія на працягу сутак вядуць бесперапынны бой з ворагам. Вайна тут паказана з пазіцыі "акопнай праўды", калі гаварыць словамі са знакамітага рамана Рэмарка "На Заходнім фронце без перамен". Менавіта непафасны гераізм артылерыстаў на перадавой лініі фронту і псіхалагічны бок стужкі ўспрымаюцца ў кантэксце кінематографа 1960-х як добрая характарыстыка карціны. Ужо ў пачатковых кадрах, калі камера павольна панараміруе па тварах байцоў у акопе, становіцца зразумелай увага аўтараў да людзей, а не да баталій, — адзначае Антаніна Аляксееўна.

Але знаходзіліся тыя, хто называў вялікім недагладам беларускага кіно вынясенне на аванасцэну ўнутраных сумневаў герояў. Аўтараў нават папракалі ў імкненні адлюстраваць у карціне "не ўласцівае савецкім воінам пачуццё асуджанасці". Такія каментарыі не зусім дакладныя, бо якраз не безнадзейнасць прасочваецца ў характарах герояў Рычарда Віктарава, а стойкасць перад зласлівымі кпінамі лёсу.

— У некаторых рэцэнзіях на фільм прагучалі папрокі ва ўтырыванні пачуццяў прыгнечанасці і асуджанасці ў персанажаў. Дарэчы, невыпадкова іх сямёра. Гэта прачытваецца як адсылка да біблейскіх матываў. Аднак дыялогі і ўчынкі людзей нясуць зарад супрацьстаяння ворагу і таварыскай падтрымкі, — разважае кінакрытык. — Да таго ж ярка гучыць матыў адплаты, калі адзіны ацалелы артылерыст Лазняк сустракаецца з дзэрцірам Задарожным, што пакінуў таварышаў у цяжкую хвіліну. Лазняк накіроўвае апошнюю зброю — ракетніцу — на здрадніка і страляе апошнім снарадам.

Сённяшняму гледачу карціна можа падацца зацягнутай, аднак гэта не падстава адкласці знаёмства з "Трэцяй ракетай" — сапраўды ўнікальным фільмам сярод ваенных стужак беларускай кінакласікі.

— Сучаснай публіцы, напэўна, будзе цікава паглядзець на дакладна адноўленую атмасферу бою, якая выступае фонам для псіхалагічнага дзеяння, — кажа Антаніна Аляксееўна. — Кагосьці можа ўразіць пераканаўчая ігра вядомых савецкіх акцёраў Георгія Жжонава і Станіслава Любшына ў ролях камандзіра і радавога байца. А хтосьці пазнаёміцца з пачаткам творчай біяграфіі рэжысёра Рычарда Віктарава, аўтара савецкай кінафантастыкі — фільмаў "Масква — Касіяпея", "Падлеткі ў Сусвеце", "Праз церні да зорак".

Яўгенія ГАБЕЦ
Фота з архіва Музея гісторыі беларускага кіно

Кадры са стужкі

Сафія Рустамава

Зорка нарадзілася

“Працаваць на свае мары і ўдасканальвацца кожны дзень!” З такім дэвізам ідзе па творчым шляху 15-гадовая Сафія Рустамава. Летась юная артыстка прадставіла Беларусь на “Славянскім базары”, здабыўшы гэты шчаслівы білет з трэцяй спробы. Дзякуючы яскравым здольнасцям і ўпартасці ўраджэнка Брэста двойчы стала стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Сафія распавяла аб сольнай кар’еры, выступленнях на самых маштабных пляцоўках краіны і жыццёвых планах.

— Калі вы ўпершыню ўзялі ў рукі мікрафон?

— У дзяцінстве ў мяне было адразу некалькі захапленняў: маляванне, вялікі тэніс, танцы. Музыкай зацікавілася ў сем гадоў. Мама стала заўважаць, што я спяваю пры любым зручным выпадку — калі пачую мелодыю з радыёпрыёмніка альбо калі трэніруюся. Таму бацькі вырашылі адправіць мяне на вакал, каб праверыць здольнасці. З радасцю пайшла на першае праслухоўванне, на якім выканала песню “Оренбургский пуховый платок” і здзівіла будучага першага педагога. Яшчэ ў шэсць гадоў я спрабавала асвоіць скрыпку. Цяпер імкнуся іграць на фартэпіяна. Ведаю сальфеджыа на высокім узроўні, і гэта дапамагае.

— Чаму для развіцця сваіх дадзеных выбралі менавіта музычную студыю?

— Займаюся з дзевяці гадоў у студыі, якая славіцца прафесіяналізмам выкладчыкаў і поспехамі вучняў. Тут я пазнаёмілася са сваім нязменным педагогам — Вольгай Драздовай. Не перастаю дзякаваць ёй за велізарны багаж вопыту. Яна навучыла мяне літаральна ўсяму і, вядома, заўжды падтрымлівала ў цяжкую хвіліну! Я ні разу не пашкадавала, што выбрала менавіта такога настаўніка.

— Вы навучэнка сярэдняй школы № 7 Брэста. Выходзіць сумяшчаць урокі і конкурсную дзейнасць?

— Я вучуся ў дзявятым класе. Гэты этап здаецца мне няпростым, таму што ў праграме ёсць складныя прадметы. Наперадзе — іспыты, да якіх трэба якасна падрыхтавацца. Але я не пускаю сітуацыю на самацёк. У мяне добра атрымліваецца сумяшчаць выступленні і школу, таму што прывыкла на працягу многіх гадоў жыць у такім тэмпе. Калі казаць пра далейшы шлях, пакуль не спынілася на пэўнай ВНУ, але ведаю дакладна: мая спецыяльнасць адназначна мусіць быць звязана з медыйнай сферай.

— Вы спрабавалі сілы ў “Дзіцячай Новай хвалі” (2020/2021), “Каляднай песеньцы года” (2021/2023). Чаму навучылі выступленні на вялікай сцэне з расійскімі зоркамі?

— Пасля майго ўдзелу ў “Дзіцячай Новай хвалі” ў 2020-м, калі я прадстаўляла Беларусь, нейкі час супрацоўнічала з Акадэміяй Ігара Крутога, якая арганізоўвае гэтыя фестывалі. Таму некалькі гадоў запар выступала на розных канцэртах у якасці запрошанай госці. Дзяліла сцэну з такімі артыстамі, як Зара, Аляксандр Панаётаў, гурт “Дыскатэка Аварыя”, Burito ды іншыя. Спяваць са знакамітасцямі — каштоўны досвед, бо яны не толькі падаюць прыклад выступлення на сцэне, але і могуць расказаць сакрэты поспеху. Гэта вельмі важна для маладых выканаўцаў.

— Вы прызёр і лаўрэат шматлікіх музычных конкурсаў: фіналістка тэлепраекта “Талент краіны” на АНТ (2019), лаўрэат I ступені рэспубліканскага радыёконкурсу “Маладыя таленты Беларусі” (2021), уладальніца гран-пры конкурсаў “Вытокі” (2021) і “Залаты голас Расіі” (2022), I прэміі фестывалю “Славянскі базар у Віцебску” (2023). Ці засталіся вяршыні, якіх плануеце дасягнуць?

— Хацела б паспрабаваць сілы ў расійскім шоу “Новая Фабрыка зорак”. Зараз мяне запрасілі на кастынг аднаго класнага праекта, але пакуль не хачу раскрываць сакрэтаў.

— У 2021, 2022 гадах па выніках нацыянальных адбораў на “Славянскі базар” вы занялі другое месца, але ў 2023-м усё ж трапілі на міжнародны фестываль. Што дапамагло не апусціць рукі?

— Застаўшыся за крок ад мары два гады запар, я сказала сабе, што любой цаной павінна прадставіць краіну на гэтым конкурсе. Я вельмі доўга ішла да мэты, старанна рыхтавалася, каб кожны раз здзіўляць журы і публіку. Лічу, у артыста павінна быць мара, якую ён мусіць у любым выпадку здзейсніць, нягледзячы на ўсе перашкоды. І я дамаглася свайго: у 2023-м на фестывалі ў Віцебску выканала песню “Акрыляй” з рэпертуару Ірыны Дарафеевай ды “I have nothing” Уітні Х’юстан. Вельмі перажывала, бо хацелася прадставіць краіну максімальна годна. У выніку стала лаўрэатам I ступені!

— Акрамя як у конкурсах, вы часта ўдзельнічаеце ў прэстыжных святах: “Апошні званок”, “Рэспубліканскі выпускны баль”, “Александрыя збірае сяброў”. Што адчуваеце падчас такіх мерапрыемстваў?

— Выступаць на вялікіх канцэртах мне падабаецца больш: няма хвалявання і журы не ацэньвае мае здольнасці. Я заўжды імкнуся выкладвацца на ўсе 100 %, таму што глядач вельмі чулы і праніклівы, яго не падманеш.

— Не так даўно вы праспявалі гімны Беларусі і Расіі на “Мінск-арэне” падчас матча хакейнай каманды “Дынама-Мінск”. Ці можна лічыць гэтае выступленне адным з найбольш незвычайных у вашай кар’еры?

— Такія моманты застаюцца ў памяці назаўсёды. Толькі ўявіце: самая маштабная арэна ў Беларусі спявала разам са мной! Гэта вельмі круты вопыт, якога зычу кожнаму выканаўцу.

— Нягледзячы на юны ўзрост, вы маеце велізарны сцэнічны досвед. У чым сакрэт паспяховага выступлення?

— Лічу, што любы артыст павінен сумленна ставіцца да гледачоў, і ўсё атрымаецца. Вядома ж, трэба разумець сэнс твора, разумець, чым ты дзелішся з публікай. Тады паміж вамі ўзнікае давер.

— У вашым рэпертуары пяць уласных песень: “Скажи мне”, “Высоко”, “Каляровыя фарбы”, “Новогодняя”, “Мечты”. Работа з якімі кампазітарамі падабаецца?

— Працую з многімі. Радуюся, калі хутка знаходзім агульную мову, дзякуючы чаму разумеем, якую песню трэба напісаць, у чым яе сэнс, у якім стылі яна загучыць. Планую сама стаць аўтарам песень і ўжо спрабую сябе ў гэтым кірунку. Упэўнена: праз нейкі час пачну цешыць слухачоў кампазіцыямі, створанымі мной.

— Як з’явілася песня “Каляровыя фарбы”?

— Яе напісаў заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь Валерый Шмат у 2021 годзе спецыяльна для “Славянскага базару”, на якім патрабуецца выкананне беларускамоўнага твора. Я лічу, што роднае слова павінна гучаць, варта папулярызаваць айчынную культуру, берагчы нашы традыцыі.

— У 2022 і 2023 гадах вы сталі стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Якое значэнне для вас мае гэтае дасягненне?

— Вялікае! Быць залічанай у банк таленавітай моладзі — адказна і ганарова. Таму я ўсімі сіламі імкнуся апраўдаць чаканні, якія ўскладу на мяне гэты статус.

— Кім бачыце сябе ў будучыні?

— З поўнай упэўненасцю магу сказаць, што вызначылася з любімай прафесіяй. Цяпер працую над рэпертуарам. Дарэчы, у працэсе новая песня, якая хутка загучыць на ўсіх пляцоўках!

Настасся ЮРКЕВІЧ
Фота гераіні

Узорны ансамбль танца "Натхненне" падчас узнагароджання

Свята Яго Вялікасці танца

III Рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва “Час танцаваць” сабраў у Канцэртнай зале “Мінск” 778 удзельнікаў (з іх 28 калектываў) ва ўзросце ад 7 да 74 гадоў. Яны прадставілі сваю творчасць у некалькіх намінацыях: класічная, сучасная і эстрадная харэаграфія, бальныя, народныя або народна-стылізаваныя танцы, а таксама вольны кірунак. Хто атрымаў гран-пры і чаму з кожным годам праект становіцца больш папулярным?

СПАБОРНІЧАЦЬ І ВУЧЫЦЦА

Гэты маштабны праект арганізаваны Рэспубліканскім культурна-асветніцкім цэнтрам Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з мэтай папулярызацыі харэаграфічнага мастацтва і захавання танцавальных традыцый. Фармат склаўся з першага конкурсу: выявіць лепшыя калектывы, даць ім магчымасць абмяняцца вопытам і навучыць чамусьці новаму. Таму “Час танцаваць” уключае ў сябе шырокую серыю майстар-класаў, якія праходзяць не толькі ў дзень спаборніцтваў, але і ў міжсезонне. Напрыклад, летась у лістападзе зладзілі вялікі семінар для паўсотні кіраўнікоў танцавальных аб’яднанняў з усёй краіны. Адмыслоўцы адточвалі тэарэтычныя і практычныя навыкі пад настаўніцтвам вядучых балетмайстраў. А ў красавіку кожны ўдзельнік змог наведаць майстар-класы “Беларускі народна-сцэнічны танец «Гуканне вясны»” і “Пошук уласнай выразнасці ў патоку імправізацыі”, якія правялі спецыялісты кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

— Конкурсны дзень — кульмінацыя той вялікай працы, якая праводзіцца на працягу года. Любы творчы калектыў жыве насычаным жыццём: развіваецца і імкнецца заняць лідзіруючыя пазіцыі ў сваёй сферы. Мы даём ім гэтыя магчымасці: паўдзельнічаць у майстар-класах, пазнаёміцца з канкурэнтамі, атрымаць фінансавую падтрымку, заяваяваўшы гран-пры, — каменціруе дырэктар Рэспубліканскага культурна-асветніцкага цэнтра Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Сідарэнка. — Усе 63 нумары, што прайшлі анлайн-адбор, ацэньвала журы, у складзе якога былі заслужаныя дзеячы мастацтваў, народныя артысты, кіраўнікі дзейных буйных харэаграфічных калектываў краіны.

ІСПЫТ НА СМЕЛАСЦЬ

Штогод склад канкурсантаў папаўняецца больш падрыхтаванымі калектывамі. Тыя хто ўдзельнічаюць не ў першы раз, успрымаюць гэта як іспыт. Бо пільна будзе ацэньвацца ўсё: ад ідэі да выбару музычнай кампазіцыі і якасці сцэнічнага касцюма. Марыя Станкевіч, удзельніца ўзорнага ансамбля танца “Натхненне”, выступала на праекце другі год запар:

— Летась наш калектыў заяваяваў гран-пры, таму быў удастоены гонару выступіць з пастаноўкай “Жураўлі ляцяць” у пралогу падчас адкрыцця. Гэтым разам мы прывезлі тры камандныя нумары і дуэт, якія журы ацаніла найвышэйшымі баламі. Я танцавала ў двух абсалютна супрацьлеглых па ідэі і настрою нумарах: “Яма” распавядае пра жахі вайны, а “Станцыя вуліца Мінская” ілюструе мірны час вясной, калі вясковыя дзяўчаты ўпершыню прыязджаюць на цягніку ў сталіцу і знаёмяцца з гараджанкамі. У выніку “Натхненне” перамагло ў намінацыі “сучасная харэаграфія”, і я гэтаму вельмі рада!

НІЯКІХ АБМЕЖАВАННЯЎ

Удзельнікамі III Рэспубліканскага конкурсу харэаграфічнага мастацтва сталі не толькі танцоры з усіх куткоў краіны, але і дзве прадстаўніцы Кітая — студэнткі беларускіх універсітэтаў. Вэй Сісі паказала кітайскі народны танец з веерамі “Самотны месяц”.

Арганізатары не ставілі абмежаванняў ні па геаграфіі, ні па ўзросце: на сцэну выйшлі выканаўцы ад 7 да 74 гадоў. Ансамбль бальнага і гісторыка-бытавога танца “Срэбны век” з Гомеля атрымаў афіцыйнае запрашэнне на праект. Пасля анлайн-адбору 66-гадовая Алена Галкіна разам са сваімі калегамі ўпершыню прыехала выступіць у канцэртнай зале “Мінск”:

— У нашым танцавальным аб’яднанні займаюся ўжо пяць гадоў, не маючы прафесійнай падрыхтоўкі. Заззяць на сцэне было марай, якую я ажыццявіла на пенсіі. “Срэбны век” бясплатна трэніруецца ў Гарадскім цэнтры культуры Гомеля. Рэпетыцыі праходзяць амаль кожны дзень. На іх мы адточваем рухі, вучым малюнкі і працуем над эмоцыямі. Сваёй творчасцю дзелімся падчас канцэртаў на Дзень горада, у санаторыях, у палацах культуры розных населеных пунктаў. На гэтае мерапрыемства прыехалі ўпершыню і паказалі два нумары: “Дунайскія хвалі” і “Вальс Марэлі”, якія цёпла ўспрынялі гледачы. Прыемна здзівіў маштаб праекта і яго арганізацыя, а таксама таленавітыя маладыя ўдзельнікі. Вельмі рады, што атрымалі дыплом лаўрэата 1 і 3 ступені. Налета прыедзем зноў, бо нам ёсць што паказаць.

ШТО ДАЛЕЙ?

Аляксандр Сідарэнка лічыць, што варта ставіць перад сабой глабальныя мэты: захаванне і памнажэнне нацыянальнай культуры ў галіне харэаграфіі, падрыхтоўка і развіццё танцавальных калектываў, знаёмства са светам мастацтва. Фармат конкурсу будзе запатрабаваны. Задача на наступны год — зацікавіць і даць магчымасць паўдзельнічаць у такім маштабным танцавальным спаборніцтве яшчэ большай колькасці калектываў.

Фрагмент выступлення Заслужанага аматарскага калектыву народнага танца "Чабарок" (нумар "Матуліна шчасце")

Відэа з конкурсу харэаграфічнага мастацтва "Час танцаваць"

Святлана Гуткоўская, старшыня журы, заслужаны дзеяч мастацтваў, прафесар БДУКІМ:

— На конкурсе было шмат эмоцый і творчых пошукаў. Па аднагалосным меркаванні журы мы аддалі гран-пры калектыву “Чабарок” з Мінска. Ён паказаў разнажанравы рэпертуар, прадэманстраваў высокую сцэнічную культуру, уразіў тэхнічным і акцёрскім майстэрствам. Галоўнае, што ў аснове іх творчасці ляжыць паэтызацыя беларускага народнага танца.

Анастасія Дзягель, кіраўніца калектыву народнага танца "Чабарок":

— Пасля атрымання гран-пры мы адчулі вялікае захапленне. Верылі, спадзяваліся, працавалі — і нашы чаканні апраўдаліся. Калектыву 37 гадоў, яго заснавала мая мама — Наталля Леанідаўна Дзягель, а мой сын танцуе ў старэйшым складзе. За час існавання мы сталі ўладальнікамі 15 гран-пры і больш за 200 разоў бралі лаўрэацтва 1 ступені. Конкурсы — важная частка нашага танцавальнага жыцця. Любы прафесійны калектыў павінен у іх удзельнічаць, каб паказваць майстэрства і адчуваць дух спаборніцтва. На праект “Час танцаваць” прыехалі ўпершыню. Вельмі ўдзячная за такую якасную падрыхтоўку і правядзенне мерапрыемства, што праходзіла на адной з найлепшых пляцовак нашай краіны. Мы прадстаўлялі свой асноўны напрамак: народную намінацыю, дзе паказалі 5 нумароў і сталі пераможцамі. Малодшая ўзроставая катэгорыя станцавала “Скокі”, сярэдняя — “Полька з трашчоткамі” і “На гары”, змяшаная група — “Матуліна шчасце” і “Уваходзіны”. Мэтанакіравана хацелі паказаць розны ўзрост — ад 6 да 19 гадоў. Стараемся з дзяцінства забяспечваць вучням прафесійнае развіццё, выкарыстоўваючы аўтарскую методыку. Грашовы прыз у памеры 200 базавых велічынь — велізарная дапамога, хочам накіраваць яе на касцюмы. У наступным годзе плануем вярнуцца на конкурс і парадаваць гледачоў зноў!

Настасся ЮРКЕВІЧ
Фота Яўгена КАСУХІ

Сцэны са спектакля

Вы былі на “Імянінах”?

П’есу “Пісаравы імяніны” Уладзіслава Галубка забылі амаль на стагоддзе, а днямі — зноў паставілі ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, дзе яна ішла ў пачатку 1920-х.

Гісторыю гэтага твора, напісанага ў 1917-м і тады ж увасобленага Першым беларускім таварыствам драмы і камедыі, трэба адлічваць з 1908-га. Менавіта тады з’явілася невялічкае аднаяменнае апавяданне Якуба Коласа пра тое, як пісар запрасіў мясцовую “эліту” на свае імяніны, ды скончылася святкаванне бойкай гасцей. Акурат як у пачатку п’есы Галубка! Таму яе першую дзею можна ў поўнай меры назваць пашыранай, максімальна разгорнутай інсцэніроўкай таго апавядання, а другую і трэцюю, у якіх знікае большасць персанажаў, — варыяцыяй на шматлікія фальклорныя казкі-гісторыі пра любоўныя прыгоды дзяка. Невыпадкова сам Галубок, падзяліўшы твор на дзве часткі, паказваў гледачам два асобныя кароткія спектаклі: “Пісаравы імяніны” і “Залёты дзяка”. Прынамсі, адна з ранейшых версій п’есы была прадстаўлена ў 1921-м у Купалаўскім, які на той час называўся БДТ.

Але ж як ставіць “Імяніны” цяпер? Як музычную камедыю — так вырашылі ў тэатры. І не памыліліся: яркая, заваднай, запамінальная музыка Алега Хадоскі, шчодра раскверчаная інтэнсіўным аркестравым развіццём і багатымі тэмбравымі фарбамі, складае большую частку поспеху. Шкада толькі, што артысты спявалі пад свой жа запіс. Але на далейшых паказах гэта будзе выпраўлена. Тым больш тэатр з самага пачатку хацеў займець у рэпертуары музычную камедыю. Адпаведную задачу паставілі перад запрошаным з Пінска рэжысёрам Паўлам Марынічам, які летась удала ўвасобіў у купалаўцаў пушкінскую “Казку пра мёртвую царэўну”. Гэтым разам творца прапанаваў тэатру шэраг розных драматургічных тэкстаў, з якіх кіраўніцтва абрала “Пісаравы імяніны”.

Павел Марыніч, як ён адзначыў падчас прэс-канферэнцыі напярэдадні прэм’еры, імкнуўся знайсці вытокі непаразумення між пісарам і жонкай. І адшукаў — у такой распаўсюджанай сёння з’яве, як імкненне мужчыны да кар’ернага росту, а не да сямейных каштоўнасцей. У пісаравай жонцы, што прыехала з горада і пакутуе ў вёсцы, рэжысёр разглядзеў тонкую мастацкую натуру, захопленую тэатрам. Творца нават уклаў у яе вусны даволі разгорнуты фрагмент з элегіі ў прозе “Літаратурныя летуценні” Бялінскага — “Ці любіце вы тэатр...”. Да такой трактоўкі пасуе і тонкая душэўная арганізацыя актрысы Таісы Увядзенскай, і падрыхтаваныя да прэм’еры афішы, флаеры, запрашальныя білеты, упрыгожаныя пер’ем. Да запрашальніка на прэс-канферэнцыю было нават прымацавана маленькае пёрка, падобнае да мар, у якіх лунае гераіня. У дзяку яна бачыць родную сабе артыстычную натуру, з якой можна пагутарыць пра высокія матэрыі. Гэтак жа, дарэчы, як і служанка Мар’я, якая туліцца да пісара, бо яе Панас увесь час на падпітку. Пары становяцца люстраным адбіткам адна адной, акрэсліваючы распаўсюджанасць праблемы. І што, завяршаць камедыю сцэнай сямейнага гвалту? У Галубка пісар б’е жонку і дзяка — і гэта канец.

У цяперашнім спектаклі фінал адкрыты. Дакладней, яго папросту няма. Пісар і ўсе-ўсе-ўсе, хто быў у яго на імянінах, гоняцца за небаракамі і знікаюць у закуліссі. Суд Лінча ці менш крывавая развязка — у любым выпадку гэта трагедыя абсалютна для кожнага, пачынаючы з пісара, кар’ера якога закоўцца. Па законах жа музычнай камедыі сямейнае непаразуменне павінна скончыцца прымірэннем, каханнем. Тым больш у цяперашняй версіі крыніцай зла выступае д’ябал-спакуснік, гэткі Мефістофель у абліччы крывадушнага дзяка, а зусім не пісарава жонка. І галава ў гераіні можа балець таму, што не падабаюцца ёй гэтыя п’янкі-карты-гулянкі з удзелам мужа. Яна ж на мора хоча! Калі ў беларускім сялянскім асяродку стагадовай даўніны такое жаданне, пэўна, і асацыіравалася з разбэшчанасцю (маўляў, загараць на пляжы імкнецца, а не ў полі працаваць), дык сёння яно паўстае паказчыкам сямейнага дабрабыту. Можа, персанажам і сапраўды ў канцы на мора зазбіраецца? Перагляд аўтарскага тэксту і асабліва фіналу для сучаснага тэатра — з’ява звыклая. А тут можна і тэкст не змяняць, вырашыўшы ўсё праз пластычную сцэну. Дарэчы, гэта дапамагло б “закальцаваць” спектакль, першая дзея якога багатая на індывідуалізаваныя пластычныя характарыстыкі персанажаў (харэограф — Людміла Фадзеева). Далей гэтая рыса, што надавала спектаклю і героям асаблівы смак, амаль знікае. Хаця сцэнаграфія Барыса Герлавана і Аляксандры Гранстрэм — лубачныя выявы спалучаюцца з сучасным светлавым заднікам — змяняецца мінімальна.

Сярод найбольш яркіх акцёрскіх прац трэба вылучыць ігру Сяргея Бірульчыка (дзяк). Дастаткова зірнуць, як ён нецярпліва цярэбіць бародку, як страляе хітрымі вачыма, з якіх літаральна пырскаюць маланкі, і паслухаць, наколькі красамоўныя тэмбравыя пералівы-мадуляцыі ў яго голасе.

Спектакль высвеціў і некаторыя пытанні — перадусім у сцэнічным маўленні акцёраў. У першым акце рэжысёр “прыхаваў” недахопы, знайшоў ім тлумачэнне: госці прыйшлі на падпітку, яшчэ і дадалі на свяце — таму і крычаць, не адчуваючы гукавога балансу. У далейшых больш інтымных сцэнах усё павінна змяніцца, але здараецца гэта не заўжды... Заўважная і нястача акцёраў сярэдняга ўзросту, з-за чаго творчую моладзь (таго ж Барыса Цяцёркіна ў ролі пісара) даводзіцца крыху “састарваць*”*. Але спектакль адбыўся, жыве — і пакідае надзею, што з часам набярэ яшчэ большую моц. Шкада толькі, частка музычных нумароў засталася “за кадрам”: магла б атрымацца пастаноўка, вартая найлепшых музычных тэатраў.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Сеанс гештальт-тэрапіі

На чорнай-чорнай вуліцы... У сталічным тэатры лялек з’явіўся спектакль для дарослых, прысвечаны дзіцячым жахалкам. З адной з іх і была пазычана назва.

Вы ніколі не задумваліся, што дзіцячыя казкі — таксама жахалкі? Ды яшчэ якія! Асабліва калі чытаць той жа фальклор у арыгінале, бо ён прызначаўся, як і ў цяперашнім выпадку, для дарослых. Ды і аўтарскія казкі мінулага ў большасці разлічваліся як мінімум на моладзь, а ў XX стагоддзі былі настолькі перайначаныя-адаптаваныя, што часам адыходзілі ад пачатковага варыянту вельмі і вельмі далёка, амаль непазнавальна. Яўген Карняг, галоўны рэжысёр Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек, спалучае “чорны” гарадскі фальклор з пераасэнсаванымі казкамі Андэрсана, у якіх выяўляе яшчэ больш дарослых адгалінаванняў, чым было ў аўтара (між іншым, Андэрсан пісаў выключна хрысціянскія гісторыі, своеасаблівыя біблейскія прыпавесці, скрозь заснаваныя на сімвалізме персанажаў, іх імёнаў, саміх сюжэтных хадоў).

У спектаклі, жанрава акрэсленым як “чорная-чорная камедыя”, многа гумару. Але ёсць і папраўдзе трагічныя павароты, што вымушаюць задумацца пра дачыненні дарослых і дзяцей, нескарыстаныя магчымасці ўзаемаразумення. У казцы “Дзяўчынка з запалкамі” гераіня гіне, бо баіцца ісці дадому: маці памерла, а бацька прыб’е за тое, што не прадала ніводнай запалкі. Хай сёння такая сітуацыя выключаная (сацыяльныя работнікі адсочваюць небяспечныя сем’і), але ж ці заўсёды мы гатовыя правільна дапамагчы дзіцяці справіцца са страхамі? Здараецца і наадварот: мы самі часам пужаем дзіця — з найлепшых памкненняў. Ды тыя, здавалася б, бяскрыўдныя дзіцячыя страхі могуць раптам абярнуцца незваротнай трагедыяй.

Страхі разглядаюцца пасляўдоўна. Спачатку, на прыкладзе “Брыдкага качаняці”, — дзіцяча-падлеткавая боязь быць не такім, як усе. Потым — праблемы няшчаснага кахання, уласцівыя моладзі (“Русалачка”). Страх нявыкананай працы, вечнага цэйтноту. Нарэшце, смерці.

Так, гэты спектакль — пра жыццё і смерць. Апошняя паўстае ў двух розных абліччах — мужчынскім і жаночым, прычым зусім не старэчым, а гуллівa-падлеткавым, амаль дзіцячым, з анёльскім галаском і сарамлівымі манерамі. Стваральнікі і артысты спакваля, даволі паступова, ды няўмольна вядуць нас да прыняцця смерці як жыццёвай неабходнасці, якая не міне нікога. Смерці як спакою. І разумення таго, што нельга выратоўваць чыёсьці жыццё за кошт смерці іншых (“Гісторыя адной маці”). Але заканчваецца спектакль на аптымістычнай, жыццесцвярджальнай ноце — у самым прамым сэнсе. Бо фіналам становіцца чарговая песня, і яе, нарэшце, развучваюць разам з залай. Прапрацаваныя, забяспечаныя доляй іроніі і здаровага сэнсу, страхі сыходзяць. Чым не гештальт-псіхалогія? І спектакль пра смерць, якой не след баяцца, адчуваючы панічныя атакі, абарочваецца гімнам жыццю, жаданнем спасцігаць кожнае яго імгненне як найвялікшы падарунак лёсу.

Вядомыя казкі атрымліваюць новыя падрабязнасці. Лебедзяня пужаецца, калі бачыць птушак, што яго не прымалі, засмажанымі на грылі. Прынц у “Русалачцы” паўстае манекенам. Ды яшчэ без галавы. Русалачка закідвае яго свежай рыбай — ён не рэагуе. Яна не ведае, што рабіць з нагамі замест хваста, таму не можа выбрацца з палонкі і нават дацягнуцца да нажа, каб забіць каханага, дзеля якога яна ахвяравала сваёй індывідуальнасцю. У “Дзікіх лебедзях” раптам узнікаюць паралелі з антычнай Антыгонай: сястра хоча не выратаваць сваіх зачараваных братоў, а годна пахаваць іх, даўно ўжо забітых. Правакацыйным становіцца інтэрактыў: публіка збірае і перадае на сцэну галлё для вогнішча інквізіцыі.

Мастак-пастаноўшчык Таццяна Нерсісян стварае нязвыклае відовішча. Штосьці накшталт вялізнай шафы з высоўнымі шуфлядамі аказваецца ячэйкамі-камерамі ў моргу. Сцэнічная прастора пашырана і за кошт подыума, які сыходзіць у залу, і праз дэталі сцэнаграфіі, што сустракаюць гледача на ўваходзе, схаваныя пад крэсламі. Лялькі — самыя розныя: ад простых дзіцячых цацак-каталак з ручкай да масак, складаных “ажылых” канструкцый, пераўтварэнняў, фокусаў, годных цырка.

Музыка Кацярыны Аверкавай — гэта і рознастылёвыя песні, уключаючы прыпеўкі, і таямніча-атмасферная фонасфера. Мы даўно прызвычаіліся, што вакал нашых лялечнікаў не саступае рабоце прафесійных спевакоў. У свой час тут ставіліся і “Папялушка” паводле аднаяменнай оперы Расіні, і канцэртныя нумары на аснове арый Моцарта. Цяперашні спектакль — чарговае пацвярджэнне акцёрскай універсальнасці.

Сямёра задзейнічаных у пастаноўцы артыстаў могуць усё: не проста ўпраўляцца з лялькамі, а папраўдзе ажыўляць іх; іграць жывым планам лепей, чым у многіх драмтэатрах; спяваць і танчыць, як у мюзікле; хадзіць на хадулях, як у цырку; смяшыць і адбудоўваць дыялогі з залай, бы найлепшыя комікі ў якіх-небудзь шоу. А галоўнае, што вынікам усяго гэтага становіцца не толькі фантан эмоцый, які пырскае эстэтычным задавальненнем і радасцю спазнання прыгожага, але і суцэльны рой думак. Яны нараджаюцца ў кожнага гледача паасобку, могуць прынцыпова адрознівацца ад думак суседа. І вядуць да непрадказальных адкрыццяў чагосьці вельмі важнага ў самім сабе — зноў-такі, строга індывідуальна.

Пасля прагляду спектакль хочацца наведаць нанова. Сесці ў іншую частку залы, знайсці новы ракурс не толькі ўласна тэатральнага дзеяння, але і яго асэсавання. Такая пазіцыя гледача — гарантыя доўгага і шчасліваго жыцця сцэнічнага твора. Я ж казала: ён менавіта пра жыццё. Як і знакамітая трыяда аўтарскіх спектакляў той жа пастаноўчай каманды ў РТБД: “Шлюб з ветрам”, “Пачупкі”, “Забалоцце”. “На чорнай-чорнай вуліцы” — быццам працяг гэтай трылогіі. Яе пастскрыптум, які знітоўвае ўсё ранейшае і адкрывае новыя мастацка-філасофскія далягляды.

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота з архіва тэатра

Фрагменты экспазіцыі



Асабістыя рэчы Юрыя Гагарына

Які ён, беларускі космас?

Язэп Драздовіч, "Космас"

У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага стартаваў выставачны праект "Першыя...", прымеркаваны да 90-годдзя з дня нараджэння Юрыя Гагарына, Сусветнага дня авіяцыі і касманаўтыкі, а таксама Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.

Удзельнікамі праекта выступілі Музей гісторыі горада Мінска, Аб'яднаны мемарыяльны музей-запаведнік Ю.А. Гагарына, прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь, Архіў Расійскай акадэміі навук, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ды Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а таксама Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі імя Хаіма Суціна.

У вывучэнні космасу кожная новая падзея робіцца ўнікальнай і непаўторнай, бо ўсё адбываецца ўпершыню. Першы палёт касмічнага карабля адкрыў для чалавецтва новыя далягляды, дазволіў убачыць нашу планету зусім інакш. Першыя даследаванні іншых планет і галактык пашырылі нашы веды аб Сусвеце і дапамаглі зразумець месца чалавека ў ім. У мастацкай культуры космас робіцца крыніцай натхнення для творчасці, узнікаюць першыя жывапісныя карціны, якія паказваюць касмічныя прасторы, адлюстроўваюць чалавечае жаданне спазнаць нязведанае і імкненне да бясконцасці. Першыя літаратурныя творы пра касмічныя падарожжы з'яўляюцца важным сведчаннем таго, як людзі марылі аб касмічных прасторах і як сабе іх уяўлялі ў мінулым.

САЮЗ ТВОРЦАЎ

Як распавяла куратар міжнародных выставачных праектаў Аб'яднанага мемарыяльнага музея-запаведніка Ю.А. Гагарына, пляменніца першага касманаўта Наталля Гагарына, гэта ўжо чацвёрты сумесны праект музея-запаведніка і Музея гісторыі горада Мінска. Акрамя таго, у Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі ў Доме Масквы ў беларускай сталіцы была прэзентаваная планшэтная выстава "Гагарын — першы назаўжды", якая з дапамогай фота і архіўных дакументаў паказвае ўвесь жыццёвы шлях Юрыя Аляксеевіча.

У экспазіцыі прадстаўленыя фота і асабістыя рэчы першага касманаўта з фондаў Аб'яднанага мемарыяльнага музея-запаведніка Ю.А. Гагарына і Архіва Расійскай акадэміі навук. Сярод іх — запальнічка, складны кубак, станок для галення і манікюрны набор. Музей гісторыі горада Мінска выставіў работы народнага мастака Беларусі, лаўрэата прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва Івана Міско — першага беларускага скульптара, які прысвяціў сваю творчасць тэме касманаўтыкі. Ён з'яўляецца аўтарам цэлай серыі скульптурных партрэтаў касманаўтаў свету. Акрамя таго, выстава месціць работы навучэнцаў узорнай студыі "Вулей" Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі імя Хаіма Суціна са Смілавічаў. Юныя мастакі стварылі ўласныя фантастычныя светы, з вялікай фантазіяй, але дужа перакананўча паказаўшы нязведаныя планеты і іх жыхароў.

МРОІ ВЕЧНАГА ВАНДРОЎНІКА

Асобны раздзел экспазіцыі прадстаўлены наробкам знакамітага беларускага мастака, скульптара, пісьменніка, этнографа, фальклярыста, археолага, астранома-аматара і заснавальніка беларускай тэарэтычнай астраноміі Язэпа Драздовіча. Яго графічныя і жывапісныя творы, маляваныя дываны ды рукапісы перадалі для выставы Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры і Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук.

Космас быў адной з асноўных тэм у творчасці мастака яшчэ ў міжваенны перыяд, за дзесяцігоддзі да з'яўлення першага касманаўта. Драздовіч сцвярджаў, што бачыў жыццё на Марсе, Сатурне і Месяцы, падарожнічаючы па іх у сваіх снах, і адлюстроўваў пабачанае ў карцінах і запісах, распавядаў пра жыццё насельнікаў іншых планет, іх звычаі, апісваў іншапланетныя гарады і прыроду. У 1931-м Драздовіч выдаў кнігу "Нябесныя бегі", у якой выклаў шэраг сваіх тэорый, у прыватнасці — аб паходжанні планет Сонечнай сістэмы і вярчэнні Зямлі. Выданне ўпрыгожылі рысункі аўтара. У 1931—1933 гадах ён працягнуў тэму космасу трыма серыямі графічных малюнкаў і жывапісных палотнаў "Артаполіс", "Жыццё на Венеры", "Жыццё на Марсе", "Жыццё на Месяцы" і "Жыццё на Сатурне". У многіх з гэтых работ мастак прадчуваў надыход вялікай вайны, якая зменіць гісторыю чалавецтва.

Першыя творы на касмічную тэматыку Язэп Драздовіч пачаў ствараць яшчэ ў 1914-м, на пачатку Першай сусветнай вайны, якую ён сустрэў на службе ў войску. Даследчыкі лічаць, што ў касмічных відзежах мастак увасабляў свае мары аб ідэальным грамадстве. У нататках ён адлюстроўваў гэта так: "З пятніцы на суботу я меў шчасце і яшчэ зрабіць адну калягадзінную вандроўачку па Месяцы. Бачыў дзіўную краіну з серабрыстым дзённым небам... Бачыў шмат крутагорых у лясістых берагох вадападаў, цяснін, астравоў. Пралятаў скрозь залацістабазальтавы грот. Бачыў гарачакрынічныя вадамёты (фантаны). Бачыў чырвонаружовы астравок, увесь укрыты нейкімі празрыстымі крышталямі... Падаўшысь углыб нейкай міжскальнай цясніны гор, я напаткаў стаячую пад шэрай скалою невялікую камлюкаватую фігурку голага чарнаскурага чалавека-ліліпута". Мастак адышоў у лепшы свет у 1954-м, не дажыўшы ўсяго пяць гадоў да палёту першага чалавека ў космас, але назаўжды зрабіўшыся першым беларускім праведнікам у заволаччнай далячыні.

Антон РУДАК
Фота аўтара

Маляваны дыван Язэпа Драздовіча

Тэатралізаваная чытка "Сымона-музыкі"

У госці да дзядзькі Якуба

Калі вам сёлета споўнілася 65, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа мае эксклюзіўную прапанову. Варта паказаць на ўваходзе пашпарт — і наведванне будзе бясплатным. З чым звязана такая шчодрасць? Усё вельмі проста: установа і сама адзначае 65-годдзе. Да святочнай даты (4 снежня) яшчэ далёка, аднак юбілейны год ужо ў самым разгары. Дзякуючы разнастайным прыдумкам музейшчыкаў, у камяніцы, якая знаходзіцца ў адным з самых заціснутых куткоў цэнтра Мінска, пастаянна віруе жыццё.

АД СЛОВА ДА РЭЧЫ

Імпрэзы цыкла "Простыя словы" ладзяцца ўжо цягам года. За гэты час у іх паўдзельнічала мноства цікавых асоб самага рознага профілю — ад усім вядомага спевака да навукоўцаў, пра якіх чулі хіба ў вузкім коле.

— Якуб Колас доўга працаваў настаўнікам і піетэт да адукацыі захоўваў усё жыццё, — кажа вядучы навуковы супрацоўнік музея **Алена Жасткова**, якая курыруе праект. — Таму ад пачатку мы ставілі перад сабою асветніцкія мэты. Сэнс у тым, каб прагаварыць пэўную займальную тэму простымі, зразумелымі кожнаму словамі.

Зрэшты, потым фармат пашырыўся. Часам наведвальнікаў чакае лекцыя, часам — гутарка з цікавай асобай, часам — паўнавартасны канцэрт... Ды і саміх удзельнікаў праекта яшчэ ўчора было цяжка ўявіць у адной абойме.

— Думаю, гэта імя Коласа ўсіх аб'ядноўвае, — гаворыць Алена Жасткова. — Павага да яго прываблівае многіх вядомых асоб. Дарэчы, спачатку мы планавалі ахапіць яшчэ больш шырокі спектр тэм. Чаму б, напрыклад, не запрашаць у музей фізікаў, хімікаў, батанікаў? Гэта цалкам адпавядае ідэі праекта. Варта нагадаць, што Якуб Колас як віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук стасаваўся з інтэлектуаламі самага рознага профілю. Ды пакуль што мы абмежаваліся толькі беларускай культурай і яе даследаваннямі.

Затое праект стаў развівацца ў іншым рэчышчы. Не так даўно ў цыкла з'явіўся спадарожнік — "Простыя рэчы". Гэта майстар-класы па розных народных уменнях.

— Мы вырашылі ад тэорыі перайсці да практыкі, — пасміхаецца суразмоўца. — Людзі сёння прагнуць нешта рабіць рукамі — каб потым забраць гэтую рэч на памяць. У музеі мы ўжо вучыліся традыцыйнай вышыўцы процягам, а перад Вялікаднем будзем размалёўваць яйкі.

ТАНЦЫ З ВАВЁРКАМІ

Некаторыя задумы сціплым штатам не ўвасобіш — патрэбны хаўрус з іншымі ўстановамі культуры. І вось Коласаўскі музей падпісаў пагадненне аб супрацоўніцтве з Рэспубліканскім тэатрам беларускай драматургіі. Так распачалася традыцыя тэатралізаваных чытак п'есы "Сымон-музыка" ў камернай абстаноўцы Песняровай гасцёўні. Налета, у сотую гадавіну першага выдання легендарнага твора, такія імпрэзы працягнуцца. Яны важныя як для публікі, якая можа ўбачыць эксклюзіўны "прадукт" з удзелам любімых акцёраў, так і для тэатра — як магчымасць намацаць глебу для будучага паўнавартаснага спектакля.

Дарэчы, менавіта камерная абстаноўка падказала музейшчыкам і яшчэ адзін новы фармат — літаратурныя чаяванні, на якіх усе ахвотныя абмяркоўваюць спадчыну класіка. Аднак выпадае, што хочацца і разгарнуцца. У музея ёсць для гэтага пляцоўка — свой дворык. У цёплы час там можна ладзіць куды больш маштабныя імпрэзы. Прыкладам, "Танцы на палянцы" (назва гаворыць сама за сябе). Танцы, зразумела, народныя, і пры жаданні ім навучыцца кожны ахвотны: "дыскатэцы" спадарожнічае майстар-клас.

— Для нас гэты дворык — сапраўдны паратунак, — прызнаецца Алена Жасткова. — Там можна зрабіць колькі заўгодна лакацый, прапанаваўшы наведвальніку на выбар самыя розныя цікавінкі.

Дарэчы, у музейным дворыку з'явіліся сталыя насельнікі — тры вавёркі, якія патрапілі туды, напэўна, з батанічнага саду. Яны, па словах супрацоўнікаў, ужо амаль ручныя: па графіку прыходзяць на сняданак і абед і патрабавальна стракочуць, калі ежа затрымліваецца. А яшчэ — з задавальненнем частуюцца грэцкімі арэхамі, якія прыносяць наведвальнікі.

Цікавыя праекты плануюцца ўлетку і ў філіялах музея — на жывапіснай Стаўбцоўшчыне. Падзеі там ладзіліся б часцей, аднак дабрацца да гэтых куткоў гасцям не так і лёгка — прынамсі, без свайго транспарту.

ЖЫВЕ ГАЛАСАМІ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ...

Калі разнастайныя і не зусім тэматычныя імпрэзы адбываюцца ў тым ці іншым мемарыяльным музеі, немінуча ўзнікае пытанне: а як бы паставіўся да такой актыўнасці гаспадар мясціны? Вядома, пра гэта можна толькі здагадвацца. Але пытанне, лічу, не пазбаўлена сэнсу.

— Справа ў тым, што вялікая зала ў доме Коласа ад пачатку была прадугледжана для прыёму гасцей, — адзначае Алена Жасткова. — Народны паэт вельмі любіў, калі да яго прыходзілі. І мы ведаем, што гасцёўню пры жыцці гаспадара запаўнялі галасы мінскай інтэлігенцыі — у паваенны час тут збіраўся, як кажуць, цвет нацыі. Таму лічым абавязкам падтрымліваць гэтую традыцыю пасля смерці класіка. Наша задача — стварыць асяродак для такіх самых зацікаўленых людзей: музей іх збірае, і яны да нас цягнуцца. Дарэчы, імя Песняра ўсплывае ў кожны з вечароў — нават калі тэма імпрэзы не мае непасрэднага дачынення да Якуба Коласа.

Яшчэ нядаўна да эксперыментаў музейшчыкі ставіліся насцярожана — бо яны ж трошкі кансерватыўныя па азначэнні! Ды той час прамінуў. Крэатыў ды інтэрактыў цяпер — трэнд, які нікога ўжо не здзіўляе. Аднак раз-пораз гучыць і крытыка: ці не губляецца ў памкненні завабіць гледача ды выклікаць у яго як мага больш эмоцый сама сутнасць музейнай працы?

— Ва ўсім свеце музей сёння ўспрымаюць не толькі як сховішча артэфактаў, але і як камунікатыўную пляцоўку для розных сацыяльных груп, — адказвае Алена Жасткова. — Гэта, вядома, і адукацыйная ўстанова. Адпаведна, наведвальнікі ёй абавязкова патрэбныя. Таму нам важна быць цікавымі для сучаснага гледача, улічваць яго запыты. І ні ў якім разе не адставаць! Лепш за ўсё наогул бегчы ўпарадзе і падказваць дарогу *(смяецца)*.

Па словах суразмоўца, разнастайнае музейнае "меню" дазваляе прывабіць тую аўдыторыю, якая раней пра ўстанову ў лепшым выпадку "нешта чула". А калі ў музеі чалавеку спадабаецца, ён распавядзе пра скарбніцу знаёмым. І такі стары добры сродак піяру, як перадача цікавінак з вуснаў у вусны, працуе не менш эфектыўна за сучасныя метады — скажам, сацыяльныя сеткі.

— На жаль, дасюль у многіх ёсць стэрэатып: музей — сумнае месца, дзе захоўваюцца мёртвыя экспанаты, а зашпіленыя на ўсе гузікі наглядчыцы пільнуюць, каб ты ціха сябе паводзіў, — дадае Алена Жасткова. — Аднак мы лічым, што музей павінен жыць галасамі наведвальнікаў, іх апладысментамі.

Ілья СВІРЫН
Фота Уладзіміра ШЛАПАКА

Імпрэзы ў музеі збіраюць поўныя залы

Кацярына Малчанава — Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава — Вераніка Юр'ева

Іх імёны — брэнды Оршы

Тут нарадзіўся стваральнік беларускага містычнага дэтэктыва Уладзімір Караткевіч. Жыў і гераічна змагаўся легендарны партызан Канстанцін Заслонаў. Сёння мы выпраўляемся ў Оршу — завітаем у скарбніцы, якія шануюць і зберагаюць памяць аб славутых імёнах.

МУЗЕЙ ЗАСЛОНАВА

Яскравае жыццё партызанскага камбрыга служыла прыкладам не аднаму пакаленню савецкіх людзей. Для ўвекавечання яго імя 1 жніўня 1948 года быў адкрыты Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава. Першапачаткова скарбніца размяшчалася ў Доме культуры. У 1952-м пад экспазіцыі перадалі будынак былога Дома піянераў. У зборы экспанатаў удзельнічалі партызаны — паплечнікі героя, яго таварышы па працы на чыгунцы, мясцовыя жыхары і супрацоўнікі Дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Установа плённа дзейнічала да 2016-га, пакуль ураганны вецер не пашкодзіў будынак. Яго прыйшлося знесці, і нейкі час прадметы экспанаваліся на стацыянарнай выставе "Легендарны камбрыг К.С. Заслонаў" у Музеі гісторыі і культуры горада Оршы. У 2020-м было прынята рашэнне аб узвядзенні будынка на ранейшым месцы — недалёка ад вакзала. І 18 жніўня 2022 года новы музей расчыніў дзверы для наведвальнікаў. Яго канцэпцыя змянілася. Дзякуючы павялічаным плошчам экспазіцыя і тэматыка значна пашырыліся. Цяпер акрамя "заслонаўскай" сюжэтнай лініі прадстаўлены падзеі ўсяго перыяду Вялікай Айчыннай вайны на Аршаншчыне.

Загадчыца Ваенна-гістарычнага музея імя Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава Вераніка Юр'ева адзначае, што новы будынак і прылеглая тэрыторыя сталі для гараджан месцам памяці, гонару і радасці за Вялікую Перамогу.

Экспазіцыю стварылі мінскія спецыялісты на аснове ўжо наяўнай калекцыі за два з паловай месяцы. У ёй — больш за 500 прадметаў. Сярод цікавых сучасных аздабленняў — атмасферная музычна-гукавое суправаджэнне.

Фрагмент экспазіцыі Мемарыяльнага музея Героя Савецкага Саюза К.С. Заслонава

Фрагменты экспазіцыі Аршанскага музея У.С. Караткевіча

У першай зале паказаны міжваенны перыяд — развіццё горада, яго захоп і ўсталяванне акупацыйнай улады. Вельмі кранальны экспанат — дзённікі сям'і Гладковых. Пара пабралася шлюбам напярэдадні вайны. Падчас акупацыі Марыя ў Горацкім раёне працавала медсястрой, а Віталь партызаніў у брыгадзе Заслонава. Не маючы сувязі, нічога не ведаючы пра лёс адно аднаго, маладыя людзі вырашылі весці дзённікі. Марыя напісала шэсць сшыткаў, Віталь восем. Праз два гады пара выпадкова сустрэлася. Яны абмяняліся дзённікамі і больш ужо не расставаліся. У 2014-м іх дачка перадала запісы музею.

Увагу прыцягваюць і агітплакаты, і муляж паравоза часоў Вялікай Айчыннай вайны, які выкарыстоўваецца як фотазона.

Другая зала прысвечаная гісторыі акупацыі і распавядае пра генацыд мірнага насельніцтва Беларусі. Тут экспануюцца фатаграфіі Аршанскага гета, пакарання мясцовых падпольшчыкаў. Факты, якія паведаміла Вераніка Юр'ева, шакуюць. Да вайны ў горадзе пражывала 40 тысяч чалавек. На момант вызвалення ў Оршы засталося ўсяго 3 тысячы. Вядома, хтосьці змог эвакуіравацца, але пасля перамогі пры будаўніцтве адной з фабрык ільнокамбіната выявілі масавае пахаванне каля 25 тысяч чалавек. Былі і іншыя пахаванні...

Гэтая частка экспазіцыі выклікае вялікі смутак. Да месца тут прыйшліся рэпрадукцыі карцін народнага мастака СССР Міхаіла Савіцкага, які быў вязнем фашысцкіх канцлагераў у Дзюсельдорфе, Бухенвальдзе і Дахау.

Зала Канстанціна Заслонава распавядае не толькі пра яго подзвігі, але і якім ён быў чалавекам. Мала хто ведае, што герой-партызан добра маляваў. Гэты дар перадаў у спадчыну ўнуку Раману Заслонаву, які стаў прафесійным мастаком. З ім музей падтрымлівае сувязь. Недалёка ад установы, у прыватызальным скверы, пахаваны прах легендарнага камбрыга.

Важна адзначыць, што 10 ураджэнцаў Оршы ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, яшчэ 11 атрымалі гэтае званне за вызваленне горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Сёння ў музеі захоўваюцца ўзнагароды, якія перадалі нашчадкі ўдзельнікаў вайны. Асаблівыя пачуцці выклікаюць моманты, калі бацькі прыводзяць сюды дзяцей і паказваюць ім ордэны ды медалі прадзедаў.

МУЗЕЙ КАРАТКЕВІЧА

Кацярына Малчанава, загадчыца Аршанскага музея У.С. Караткевіча, з гонарам падкрэслівае, што іх установа месціцца ў помніку архітэктуры. Тут калісьці была радзільня, дзе 26 лістапада 1930 года з'явіўся на свет будучы класік беларускай літаратуры.

Творы Уладзіміра Караткевіча пакідаюць глыбокі след у душах чытачоў, таму для Кацярыны Малчанавай не дзіўна, калі наведвальнікі адзначаюць, што адчуваюць у старадаўнім будынку дух Караткевіча. Тут нават ёсць адмысловы музейны анёл — мастацкае ўвасабленне пісьменніка. Яго зрабілі майстры Аршанскага дома рамёстваў.

Асабістыя рэчы літаратара, яго сваякоў і сяброў — самыя каштоўныя і рарытэтныя экспанаты музея. Першая зала канцэптуальна прадстаўляе розныя перыяды жыцця пісьменніка і мае назву "Вокны Караткевіча". Кожнае з іх нібыта пераносіць у дзяцінства, эвакуацыю, пасляваенныя падлеткавыя гады ў Оршы, творчае жыццё класіка ў Мінску. Таксама можна даведацца пра студэнцкія гады ў Кіеве, вучобу на вышэйшых літаратурных курсах у Маскве.

У гэтым музеі пачынаеш усведамляць усю моц уплыву Караткевіча на развіццё айчыннай культуры ў другой палове мінулага стагоддзя. Творца пісаў раманы, вершы, казкі, сцэнарыі кінастужак, тэатральныя п'есы. Да прыкладу, "Беларусьфільм" выпусціў не толькі ўсім вядомыя "Дзікае паляванне караля Стаха" і "Чорны замак Альшанскі", але і тры выдатныя мультфільмы для дзяцей па яго казках.

Наведвальнікаў у музеі шмат. Многа падлеткаў, моладзі. Пэўную ролю адыгрывае тое, што творы Караткевіча ўключаны ў школьную праграму. Але хапае і дарослых, якія мэтанакіравана прыязджаюць сюды з розных гарадоў Беларусі і замежжа. Геаграфія вельмі шырокая, адзначае Кацярына Малчанава.

Супрацоўнікі ўстановы імкнуцца прапанаваць гасцям усялякія цікавінкі. Квэсты распрацаваныя пад розныя ўзроставыя катэгорыі — у гульнявой форме людзі лепей засвойваюць інфармацыю. Штогод музейныя мерапрыемствы і экспазіцыю наведваюць больш за шэсць тысяч чалавек.

Віктар ГАЎРЫШ
Фота аўтара

Сцэна са спектакля. Фота з архіва РТБД

Адказаць, паглядзець і... атрымаць асалоду

Віталь Бірзгал

Першым сярод чытачоў, якія правільна разгадалі чайнворд у газеце № 14 ад 5 красавіка, стаў Віталь Бірзгал з Мінска. Ён афіцэр запасу, на пенсіі. Па словах пераможцы, да "Культуры" яго прывучыла жонка, якая рэгулярна праглядае наша выданне. І вось аднойчы ўвечары ім на вочы трапіўся чайнворд. Пагартаўшы нумар ад 29 сакавіка, сямейная пара справілася з галаваломкай. Цяпер муж і жонка адпраўваюцца ў тэатр, дзе любяць бываць у вольны час. Што іх там чакае?

П'еса сучаснага ірландскага драматурга Марціна МакДонаха — так-так, таго самага сцэнарыста і рэжысёра культавых "Залегчы на дно ў Бруге", "Сем псіхапатаў" і "Тры білборды на мяжы Эбінга, Місуры" — напісана пра іншаземцаў і пастаўлена ў беларускім тэатры.

Чаму варта трапіць на спектакль? Неўзабаве пасля яго пачатку вы забудзеце, што "знаходзіцеся" ў Ірландыі, і ўбачыце простых людзей з іх гісторыямі, праблемамі, страхамі і сакрэтамі. І асобы гэтыя вельмі абаяльныя ды цікавыя!

Твор "Калека з вострава Інішман" расказвае аб разуменні чалавекам свайго месца, аб унутраным стрыжні і аб тым, што найлепшая падтрымка — не графа ў рэзюмэ і грошы, а блізкія побач. І, магчыма, пазней вам захочацца сказаць: "Ірландыя — не такое ўжо і захалусце, калі пра яе спектаклі ў РТБД ставяць" (гэтую фразу вы зразумееце пасля прагляду).

Сёння публікуем новае заданне па № 14 ад 5 красавіка. Пераможцу таксама чакаюць два білеты на пастаноўку заслужанага калектыву Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі ў Цэнтральным Доме афіцэраў (паказ 26 красавіка).

Паважаныя чытачы — прыхільнікі тэатра! Дасылайце адказы ў выглядзе фота (старонка друкаванай версіі газеты з запоўненым чайнвордам) на адрас электроннай пошты reklama@kultura-info.by ці ў Viber на нумар 8 029 8233532 да 22 красавіка.

Нясем культуру, жывем мастацтвам!

Адказы на чайнворд ("К" № 14 ад 05.04.2024):
1. Трагікамедыя. 2. Яўген. 3. Надзея. 4. Ярмоленка. 5. Аркестр. 6. Рубановіч. 7. Чайка. 8. Азёркі. 9. Іванава. 10. Астравец. 11. Цудатворная. 12. Яўгенія.

Пагартайце "К" № 14 ад 5 красавіка і запоўніце чайнворд.

1. Той, хто з вострава Інішман.
2. Населены пункт, які атрымаў шырокую вядомасць, калі ў ім запрацавала Беларуская ДРЭС.
3. Прозвішча намесніка дырэктара па навуковай рабоце Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры.
4. Краіна, дзе ў пачатку красавіка ладзіліся Дні культуры Беларусі.
5. Горад, у якім працуе выстава "Старажытны час Навагрудчыны".
6. Дзіцячы тэатральны форум.
7. Востраў.
8. 3652 экзэмпляры нашай газеты ў красавіку.
9. Установа адукацыі ў сферы культуры.
10. Спектакль, які адбыўся 5 красавіка ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага.
11. Прозвішча начальніка аддзела па кінематаграфіі Міністэрства культуры.
12. Апошняя старонка "К".
13. Божая Маці ... .



Афіша з 12 па 19 красавіка

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20, тэл.: 8 017 3970163 (экскурсійнае бюро)

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Мабільная планшэтная выстава Дзяржаўнага Рускага музея **"Шэдэўры Рускага музея"**, падрыхтаваная пры падтрымцы прадстаўніцтва Рассупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь. **Да 16 красавіка.**
- Выстава **"Ракурсы творчасці: зямля, вада, неба"** народнага мастака Беларусі, майстра лірыка-эпічнага пейзажа, тэатральнага жывапісца, мастацтвазнаўца і таленавітага педагога Паўла Васільевіча Масленікава (1914–1995), прысвечаная 110-годдзю з дня нараджэння творцы. **Да 21 красавіка.**
- Экспазіцыя **"Браслаўскі край і Налібоцкая пушча — жамчужыны Беларусі"**. Выставачны корпус, вул. Карла Маркса, 24. **Да 20 мая.**
- Экскурсіі: **"Самыя-самыя..." (6+), "Якога колеру зіма?" (6+), "Казкі Усходу" (10+), "Міфы Старажытнай Грэцыі і Рыма" (10+), "Партрэты даўнія мінулых пакаленняў..." (10+), "Пяць моў кахання" (16+), "Жаночы партрэт" (16+), "Мінск у музеі" (16+)**. **Праводзяцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА 1-Й ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а, тэл.: 8 017 3637796, 8 017 3588878

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава графічнага партрэта XIX стагоддзя **"Погляд"** з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. **Да 15 мая.**
- Брэйн-рынг **"Эрудыцыя. Упэўненасць. Поспех"**. У гульні могуць прыняць удзел любыя арганізаваныя групы.
- Квэст **"Пошукі мінулага"**. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Інтэр'ер шляхецкай сядзібы"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Шлях мастака Валенціна Ваньковіча"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**
- Экскурсія **"Сядзібны партрэт"**. Папярэдні запіс. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Мінскі р-н, Астрашыцка-Гарадоцкі с/с, в. Аколіца, вул. Іванаўская, 176, тэл.: 8 017 5074468

- **Пастаянная экспазіцыя.**
- Выстава работ вядомага народнага майстра, разьбяра па дрэве, жывапісца, графіка Апалінарыя Флярыяновіча Пупко (1893–1984) **"Я беларус"**. **Да 28 красавіка.**
- **Батлеечны спектакль. Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Саломапляценне"**. **Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Лялька-мотанка"**. **Праводзіцца заўсёды.**
- Майстар-клас **"Ткацтва"**. **Праводзіцца заўсёды.**

УНП 100377771

МУЗЕЙ В. К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37, тэл.: 8 0222 650203, 8 0222 658800

- **Пастаянныя экспазіцыі.**
- Art-lectorium **"Зразумелае мастацтва"**. **Праводзіцца заўсёды.**

Падрабязней на сайце **artmuseum.by** альбо па тэлефонах 8 0222 650203, 8 0222 658800.

УНП 100377771

МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

г. Магілёў, вул. Першамайская, 7,
тэл.: 8 0222 656604 (каса),
сайт: **mdrama.by**

• Медыйны спектакль **“Жаніцьба. Фантасмагорыя” (12+)**. Прэм’ера. **12 красавіка ў 18.30.**
• Музычная казка ў 1 дзеі **“Дзюймовачка” (0+)**. **13 красавіка ў 12.00.**
• Смешная гісторыя кахання непатрэбных людзей у 2 дзеях **“Дурнічка і зэк” (16+)**. **13 красавіка ў 18.30.**
• Рамантычная казка з чараўніцтвам і ператварэннямі **“Усе мышы любяць сыр” (6+)**. **14 красавіка ў 12.00.**
• Камедыя ў 1 дзеі **“Настаўленне для ахвотных ажаніцца” (16+)**. **14 красавіка ў 18.30.**
• Сучасныя вадэвілі ў 1 дзеі **“Спадары, таварышы, сволачы і дамы” (16+)**. **16 красавіка ў 18.30.**
• Камедыя ў 2 дзеях **“Тарцюф” (16+)**. **17 красавіка ў 18.30.**
• Экзістэнцыйная камедыя ў 2 дзеях **“Ю” (16+)**. **18 красавіка ў 18.30.**
• Трагедыя па матывах камедыі **“Дон Жуан” (16+)**. Прэм’ера. **19 красавіка ў 18.30.**
• Музычная казка ў 1 дзеі **“Як Кашчэй Бессмяротны з Васілісай ажаніўся” (6+)**. **20 красавіка ў 12.00.**
• Рамантычная камедыя ў 2 дзеях **“Я бяру гэтага хлопца” (16+)**. **20 красавіка ў 18.30.**

УНП 700184039

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7,
тэл.: 8 017 3654237, 8 017 3576627,
пошта: kupalabilet@mail.ru

• Містычная легенда пра каханне ў 1 дзеі **“Чорная панна Нясвіжа” (12+)**. Галоўная сцэна. **12 красавіка ў 19.00.**
• Канцэрт **“Сусветныя хіты XX стагоддзя” (12+)**. Жывы гук. Галоўная сцэна. **13 красавіка ў 18.00.**
• Музычная камедыя па п’есе У. Галубка ў 2 дзеях **“Пісаравы імяніны” (16+)**. Прэм’ера. Галоўная сцэна. **13 красавіка ў 19.00.**
• Трагікамедыя **“Чакана гучна і да болю блізка” (16+)**. Камерная сцэна. **15 красавіка ў 19.00.**
• Імпрэза **“Музыка душы. Роднае” (0+)**. Камінная зала. **15 красавіка ў 19.00.**
• Камедыя ў 2 дзеях **“Паўлінка” (12+)**. Галоўная сцэна. **16 красавіка ў 19.00.**
• Драма **“А зоры тут ціхія” (12+)**. Прэм’ера. Галоўная сцэна. **17 красавіка ў 19.00.**
• Трагіфарс **Donna sola (“Жанчына адна”) (18+)**. Камерная сцэна. **18 красавіка ў 19.00.**
• Імпрэза **“Музыка душы” (0+)**. Камінная зала. **18 красавіка ў 19.00.**
• Звычайная гісторыя **“Час жыцця” (12+)**. Галоўная сцэна. **19 красавіка ў 19.00.**

УНП 100377901

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай Камуны, 1,
тэл.: 8 017 2431041 (каса),
8 017 3615493

• Экскурсія **“Унікальны свет закулісся Вялікага тэатра Беларусі” (6+)**. **12 красавіка ў 16.00, 18 красавіка ў 16.00, 19 красавіка ў 19.00, 20 красавіка ў 14.00.**
• Балет у 2 дзеях **“Жыззэль” (12+)**. **12 красавіка ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **“Гісторыя Кая і Герды” (“Снежная каралева”) (6+)**. **13 красавіка ў 18.00, 14 красавіка ў 11.00.**
• Балет у 3 дзеях **“Баядэрка” (12+)**. **14 красавіка ў 18.00.**
• Канцэрт **“Музычны круіз” (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **14 красавіка ў 18.30.**
• Опера ў 3 дзеях **“Самсон і Даліла” (12+)**. **16 красавіка ў 19.00.**
• Балет у 3 дзеях **“Дон Кіхот” (12+)**. **17 красавіка ў 19.00.**
• Аперэта ў 3 дзеях (выконваецца з адным антрактам) **“Лятучая мыш” (12+)**. **18 красавіка ў 19.00.**
• Канцэрт **“Пастух на скале” (12+)**. Камерная зала імя Л. П. Александроўскай. **18 красавіка ў 19.30.**
• Балет у 2 дзеях на музыку Пятра Чайкоўскага **“Ганна Карэніна” (16+)**. **19 красавіка ў 19.00.**
• Опера ў 2 дзеях **“Чароўная флейта” (12+)**. **20 красавіка ў 18.00.**

УНП 191081522

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК “НЯСВІЖ”

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19,
тэл.: 8 01770 20602, 8 01770 20660,
8 029 5518051, 8 029 1903149

Палацавы ансамбль
• Тэатралізаваная экскурсія **“Чорная панна Нясвіжа”**. **13, 14, 21 красавіка.**
• Выстава работ удзельніц Міжнароднай школы аматараў ірландскіх карунак **“Велікодныя сувеніры”**. Калекцыйны кабінет “Нумізматыка і фалерыстыка”. **Да 7 мая.**
• Выстава сучаснага скульптара Максіма Петруля **“4х4”**. **Да 15 чэрвеня.**
• Выстава **“Маджарскія: армянскі род у гісторыі Беларусі”**. Калекцыйныя залы “Слуцкія паясы”. **Да 31 ліпеня.**
• Часовая экспазіцыя **“Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны”**. **Да 13 кастрычніка.**
• Экспазіцыя **“Цудатворная Жыровіцкая ікона Божай Маці ў камені”**. Аўтар праекта А. Папельскі. Малая выставачная зала. **Да 18 лістапада.**
• Міжнародны выставачны праект **“Castrum doloris. Пахавальны цырыманіял нясвіжскага двара”. У складзе пастаяннай экспазіцыі.**
• Квэст **“Палацавыя таямніцы”**.
• Віртуальныя выставы: **“Ператвораныя ў попел. Генацыд беларускага народа на тэрыторыі Нясвіжскага раёна ў гады вайны”**, **“Нясвіж — здабытак сусветнай культуры”**, **“Разбуральны след вайны ў архітэктуры Нясвіжа”**, **“Шэдэўры калекцыі і ўнікальныя артэфакты музея-запаведніка «Нясвіж»”**.
• Тэматычныя і аглядныя экскурсіі па гісторыка-архітэктурных помніках і ландшафтных парках Нясвіжа.

Ратуша (г. Нясвіж, вул. Савецкая, 3)
Пастаянныя экспазіцыі
• **“Гарадское самакіраванне ў Нясвіжы ў XVIII — 1-й палове XIX ст.”.**
• Калекцыя гадзіннікаў XIX–XX стагоддзяў **“Культура часу”**. З фондаў музея-запаведніка.

Мерапрыемствы
• Квэсты: **“Безаблічны артэфакт”**, **“Карта сямі каралеўстваў”**, **“Музейны дэтэктыў”**, **“Музейнае расследаванне”**.
• Культурныя мерапрыемствы: **“Прыём у княгіні”**, **“Дзень нараджэння ў ратушы”** (група да 12 чалавек ад 6 да 11 гадоў).
• Сюжэтна-ролевая развівальная праграма **“Школа шпіёнаў”** (да 25 чалавек).
• Гульня-знаёмства **“Музейка аб музеі”** (група да 25 чалавек ад 4 да 7 гадоў).
• Гульнявая праграма **“Выкрунтасы”** (група да 25 чалавек).

Падрабязнасці па тэлефонах 8 01770 20602, 8 01770 20660 або на сайце **niasvizh.by**.

УНП 600207920

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС “МІР”

г. п. Мір, Карэліцкі р-н,
Гродзенская вобл.,
тэл.: 8 01596 36290,
8 01596 36270

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Лекцыя-візуалізацыя **“Прадметы з запаснікаў музея”**. Прадугледжаны паказ рэдкіх аб’ектаў з фонду — сведак эпохі Вялікага Княства Літоўскага: кнігі Казіміра Семяновіча “Вялікае мастацтва артылерыі. Частка 1”, карты ВКЛ сярэдзіны XVII ст., шляхецкага пояса XVIII ст. і іншых. **У кожную сераду і суботу красавіка.**
• Часовая экспазіцыя **“Вялікая княгіня Вольга Аляксандраўна. Усё жыццё як на палатне”** з аўтаномнай установы культуры Варонежскай вобласці “Гісторыка-культурны цэнтр «Палацавы комплекс Альдэнбургскіх»”. Слановая зала. **Да 2 мая.**
• Экспазіцыя **“Войны XX стагоддзя. Гета ў Мірскім замку”**.
• Аглядныя і тэматычныя экскурсіі.
• Экскурсіі з элементамі тэатралізацыі для дзяцей і дарослых.
• Экскурсія для дваіх **“Інтрыгі Купідона”**.
• Сямейная квэст-экскурсія **“Легенды і паданні Мірскага замка”**.
• Музейныя заняткі для дзяцей сярэдняга школьнага ўзросту: **“Святочная страва для князя па старадаўнім рэцэпце”**, **“Асаблівасці жаночага касцюма XVIII ст.”**, **“Арганізацыя войска і вайсковая справа ВКЛ у XVI ст.”**, **“Печы з каробкавай кафлі XVI–XVII стст. у палацы князёў Радзівілаў”**.

УНП 590201541

ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ ФІЛАРМОНІЯ

г. Віцебск, вул. Леніна, 69,
тэл.: 8 0212 368387 (каса),
сайт: **vitebsk-fil.by**

• Канцэрт эстраднай музыкі **“ЗАМАК З ДАЖДЖУ” (6+)**. **19 красавіка ў 19.00.**
• Прадстаўленне **“КАША З СЯКЕРЫ” (3+)** у межах праекта **“ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ”**. **20 красавіка ў 11.00.**
• **“АЛЯКСАНДР ФІСЕЙСКІ І ЯГО ВЫХАВАНЦЫ” (6+)** у межах **ЕЎРАЗІЙСКАГА АРГАННАГА МАРАФОНУ — 2024**. **20 красавіка ў 19.00.**
• Прадстаўленне **“ЗАЛАТОЕ КУРАНЯ” (3+)** у межах праекта **“ФІЛАРМОНІЯ — ДЗЕЦЯМ”**. **21 красавіка ў 11.00.**
• Да 90-годдзя **ЯЎГЕНА КРЫЛАТАВА. “ПРЫЎКРАСНАЕ ДАЛЁКА” (6+)**. **21 красавіка ў 18.00.**

УНП 300149385

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8,
тэл.: 8 017 2030792, 8 029 1440792,
8 017 3271166

• **Пастаянная экспазіцыя.**
• Часовая экспазіцыя **“Вызваленне Еўропы”**.
• Часовая экспазіцыя **“Адзінай памяці верныя”**, прысвечаная 80-годдзю з пачатку вызвалення Беларусі.
• Часовая экспазіцыя **“Музей. Час. Памяць”**, створаная ў рамках праекта “Адкрытыя фонды”.
• У продаж паступілі сертыфікаты на наведванне музея.

Падрабязнасці на сайце **warmuseum.by**.

УНП 100235472

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ЦЭНТР СУЧАСНЫХ МАСТАЦТВАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Някрасава, 3,
тэл.: 8 017 2350331,
час працы: серада — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Міжнародны выставачны праект **“Сто ўсмешак Гагарына. Усмешка для Свету”**. **Да 21 красавіка.**
• Міжнародная выстава **“Саярсізм”**. **Да 26 мая.**

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 47,
тэл.: 8 017 2350332, 8 017 3990978,
час працы: аўторак — нядзеля
з 12.00 да 20.00

• Выставачны праект **“Архітэктурныя жарсці”**. **Да 28 красавіка.**

УНП 192543414

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ БЕЛАРУСКІ ТЭАТР “ЛЯЛЬКА”

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2,
тэл.: 8 0212 669077 (каса)

• Казка ў 2 дзеях паводле персідскага эпасу “Тысяча і адна ноч” — **“Аладзін” (6+)**. **13 красавіка ў 11.00.**
• Маляўнічая казка ў 1 дзеі **“Як куранятка голас шукала” (0+)**. Прэм’ера. Фае тэатра. **14 красавіка ў 10.30, 16 красавіка ў 18.00, 20 красавіка ў 20.30.**
• Правілы па тэхніцы бяспекі для маленькіх сабачак і непаслухмяных дзяцей у 1 дзеі **“Асцярожна, Соня!” (3+)**. **14 красавіка ў 12.00.**
• Рэмінісцэнцыі pro domo sua у 2 дзеях **“Мастак. Вяртанне ў Віцебск” (16+)**. Прысвячаецца Марку Шагалу. **20 красавіка ў 18.00.**

УНП 300001869

Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь
аказвае фізічным і юрыдычным асобам паслугі па рэстаўрацыі і кансервацыі ікон, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.
Тэлефоны: **8 017 3970163**, **8 025 6677819**.
УНП 100377771

t.me/kultinfa

Карыстаецеся стыкерамі ў анлайн-ліставанні і хочаце папоўніць сваю калекцыю? Прапануем стыкерпак ад “Культуры”! Выказаць эмоцыі вам дапамогуць класікі беларускай літаратуры. Выбірайце самую трапную цытату — і здзіўляйце суразмоўцаў у Telegram!

2006 2010 2022

КУЛЬТУРА

Сайт: kultura-info.by
E-mail: kim@kultura-info.by

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА). Выдаецца на беларускай мове.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".

Дырэктар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Рэдакцыя газеты "Культура":

Галоўны рэдактар — КУЗНЯЦОВА Наталля Васільеўна.

Намеснік галоўнага рэдактара — ШЧУРОК Жанна Генадзьеўна.

Адказны сакратар — Галіна МАЛІНОЎСКАЯ.

Рэдактар аддзела — Віктар ГАЎРЫШ.

Аглядальнікі рэдакцыі — Яўгенія ГАБЕЦ, Антон РУДАК, Ганна САКАЛОВА, Ілья СВІРЫН, Даніїл ШЭЙКА, Зміцер ЮРКЕВІЧ, Настасся ЮРКЕВІЧ.

Рэдактары літаратурныя — Мацвей ЗАЙЦАЎ, Лідзія НАЛІЎКА. Рэдактар мастацкі — Мікалай КАСЦЮКОЎ.

Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх.

Тэлефон: 8 017 2860797.
Тэлефон-факс: 8 017 3345741.
Бухгалтэрыя: 8 017 3345735.
Рэкламны аддзел: 8 017 2860797.

Падпісныя індэксы: 63875, 638752, 63879.
Льготныя на паўгоддзе: 63872, 638722 (зніжка 15 %).
Камплект (газета "Культура" і часопіс "Мастацтва"): 63874, 638742 (зніжка 10 %).

Рознічны кошт — па дамоўленасці.

* — матэрыял на правах рэкламы.

Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванне аўтара можа не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

Падпісана ў друк 11.04.2024 у 16.00. Замова № 808. Наклад 3652.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва «Беларускі Дом друку»". 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004.

© "Культура", 2024.